PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 38 (2471) Год XLVIII | Беласток, 21 верасня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Тоеснасць (не)рэгіянальная

Мацей Халадоўскі

І зноў героем апошняй сесіі ваяводскага сейміка стаў радны Зэнан Дзедзіц — дзякуючы чарговай спробе наступу на таварыства і культурны цэнтр „Пагранічча" ў Сейнах. Ён нават перабіў на момант манатонную нараду над непрыцягальнымі з пункту гледжання выбаршчыка-падаткаплацельшчыка пастановамі.

Радныя засяродзіліся перш за ўсё на руцінных пытаннях, як выкананне бюджэту ў першым паўгоддзі ці папраўках у стратэгію развіцця ваяводства. Цікавінкі скрываліся ў дэталях, а лепш сказаць — недапрацоўках ці недамоўках вынесеных на абмеркаванне прапаноў.

У час дыскусіі аб выкананні бюджэту апазіцыя (Ліга польскіх сем'яў — LPR ды Грамадзянская платформа — Права і справядлівасць — PO-PiS) асцерагала ўправу ваяводства (СЛД, ПСЛ, былыя радныя „Самаабароны"), што план дэфіцыту сёлетняга бюджэту можа правалiцца, асабліва з-за вынікаў праверкі Найвышэйшай кантрольнай палаты, якая папракнула ваяводскія ўлады м.інш. у 7 мільёнах непагашаных абавязацельстваў. Аднак, маршалак Януш Кшыжэўскі супакойваў:

— 2003 год — пачатак рацыянальнага расходавання публічных грошай, пагашэння даўгоў найбольш запазычанага ў Польшчы ваяводства!

Пры нагодзе выявілася, што апаскі наконт недахопу ў прыбытках ад продажу самаўрадавай маёмасці — неабгрунтаваныя. Трэба было ўнесці ў бюджэт адпаведны запіс, які забяспечыць магчымасць фінансавых перамоў з крэдыторамі, але не абазначае гэта, што ваяводскую нерухомую маёмасць трэба прадаваць адразу. Тым больш, што купцы на гэтыя не надта прываблівыя самаўрадавыя будынкі фактычна не вельмі спяшаюцца. Гэты запіс пра 8 мільёнаў дзеля падмацавання бюджэту фактычна застаецца на паперы, а на практыцы, як адзначылі прадстаўнікі самаўрада, мабыць, удасца зарабіць на продажу аднаго аб'екта — па вуліцы Засцянскай у Беластоку — 2,5 млн. зл. Апазіцыя разважала, што гэта за такі запіс, які гаворыць аб прыбытках ад продажу электраэнергіі. Ці раптам ваяводскі самаўрад стаў уласнікам нейкага электразавода? — пытаўся радны Цеслюкоўскі з PO-PiS. Або, прынамсі, турбіны? — жартаваў старшыня сейміка Збігнеў Кшывіцкі (SLD). Прадстаўнікі самаўрада патлумачылі, што гаворка тут аб прыбытку ад гідрастанцыі ў Семяноўцы.

Трохі цікавей зрабілася ў час дыскусіі пра папраўкі ў стратэгію развіцця Падляшскага ваяводства. Зэнан Дзедзіц з LPR, якога ў закуліссі называюць „крыважэрным Дзедзіцам" (дзякуючы нацы-

[працяг ☞ 2]

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Марта Федарук, Кацярына Кандрацюк, Агнешка Шыманюк і Юстына Ігнацюк — стыпендысткі Цэнтра грамадзянскай адукацыі „Польшча — Беларусь" з дырэктарам гайнаўскага ліцэя Яўгенам Сачко і праграмным дырэктарам Цэнтра Яўгенам Вапам (справа)

Найлепшым — стыпендыі

На ўрачыстасці ў беластоцкай ратушы 29 стыпендыяў атрымалі вучні гімназій і студэнты першага курса з Падляшша. Стыпендыі фундавала Асацыяцыя дзеля эстэтычнай адукацыі „Відок". На незвычайную ўрачыстасць у Падляшскі музей прыбылі амаль усе самыя таленавітыя лаўрэаты, іх бацькі і настаўнікі. Ідэю Стыпендыяльнай праграмы ўвяла ў жыццё Магдалена Сівэрска-Гадлеўская, старшыня Асацыяцыі, якая дзейнічае тры гады. Каб памагчы таленавітай моладзі, якая дасягае добрых вынікаў у вучобе, спорце і іншых галінах, а адначасова не можа сабе дазволіць на поўны развой сваіх зацікаўленняў па прычыне нястач у сям'і. Фонд стыпендыяльнай дапамогі распачаў дзейнасць дзякуючы дапамозе Фонду імя С. Баторыя, Цэнтра грамадзянскай адукацыі „Польшча-Беларусь", суполцы „Auchan" Польшча, Юстыне Младзяноўскай, працаўнікам філалагічнага і педагагічна-псіхалагічнага факультэтаў Беластоцкага універсітэта, фірмам Weil, Gotshal&Manges LLP, Паўлу Рымажу і гмінам у Чорнай-Беластоцкай, Гайнаўцы, Міхалове, Крынках, Нарве, Нараўцы, Туросні-Касцельнай і Васількаве. Да канца чэрвеня г.г. заявы вучняў можна было падаваць у Фонд развіцця лакальнай дэмакратыі (ён займаўся адміністрацыйнай абслугай праграмы). Заяў было 160 з гмін, якія фінансава дакладаліся да фінансаў, але прымаліся заявы і з гмін, якія пакуль што не ўключыліся ў праграму. Камісія запрапанавала 25 навукова-сацыяльных стыпендый (у гэтым тры сямейныя), і дзве спецыяльныя. Медыяльны апякун мерапрыемства „Кур'ер паранны" фундаваў спецыяльную стыпендыю Эвеліне Касакоўскай — гімназістцы з Харошчы, паэтцы, журналістцы мясцовай газеткі. Стыпендыі атрымалі: Агнешка Пасталовіч, Моніка Салецкая і Агнешка Сакалоўская з Чорнай-Беластоцкай, Маргарыта Харкевіч, Якуб Чарнэцкі, Марта Федарук і Юстына Ігнацюк з Гайнаўкі, Мар'юш Хробак, Уршуля Бакун, Альжбета Мандраж і Эліза Вэнцлаўская з Крынак, Эмілія і Дарота Кандратовіч ды Лукаш і Марына Самойлікі з Міхалова, Міраслава Ахрымюк, Ізабела Нармантовіч і Караль Герасімюк з Нарвы, Дыяна Грыц з Нараўкі, Іаанна Кратовіч з Туросні-Касцельнай, Ганна, Дарота і Іаланта Царыкевіч ды Эльвіра Вэнда з Васількава, Іаанна Дамбоўская з Харошчы, Эмілія Радзевіч з Гарадка, Эвеліна Лемех з Суража, Ганна Скавародка з Дубіч-Царкоўных і Зузанна Мразоўская з Ганёндза. Спартыўную стыпендыю, фундаваную ананімным ахвяравальнікам, атрымала Кацярына Касабула. Спецыяльную стыпендыю атрымаў таленавіты фатограф Павел Гжэсь з Гарадка, ужо студэнт архітэктуры. Пяць стыпендый фундаваў Цэнтр грамадзянскай адукацыі „Польшча — Беларусь" таленавітым вучням, якія вывучаюць беларускую мову. Гэта Марта Федарук (II клас гімназіі), Юстына Ігнацюк (IV „ц" клас белліцэя) з Гайнаўкі, і „памоставыя" стыпендысткі Кацярына Кандрацюк — ужо студэнтка біятэхналогіі, нараўчанка Агнешка Шыманюк — студэнтка факультэта ўсходнеславянскіх філалогій БУ і Альжбета Раманюк, студэнтка заатэхнікі ў Седльцах. (лук)

З перапяліцай у Чыжах ☞ 3

Дажынкі пачаліся малітвамі. Члены калектываў з Чыжоўскай гміны разам з войтам Юрыем Васілюком і прадстаўнікамі сялян занеслі дажынкавыя вянкі разам з хлебам і сллю ў царкву. Пасля Літургіі адслужаны быў малебен. Айцец Іаан Раманчук асвяціў прынесеныя плёны і на беларускай мове падзякаваў гаспадарам за працу.

Цень Садама ☞ 4

У Польшчы выпадкова дапусцілі да мікрафона аднаго з апошніх сумленных палітыкаў Яцка Кураня, які пры першай нагодзе сказаў, што ўдзел палякаў у агрэсіі і акупацыі Ірака гэта ганьба для краіны і арміі. Наступнага дня прэзідэнцкі міністр апраўдаў палітыку свайго шэфа словамі, што палякі маюць гонар змагацца за супольную справу разам з амерыканцамі.

З новымі сіламі ☞ 5

Распачало вучобу ў „тройцы" звыш 920 асоб, якія будуць займацца ў 36 класах. Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы з'яўляецца адзінай школай у Бельску, у якой расце колькасць вучняў. Паколькі ў школе толькі 23 класавыя залы, вучоба будзе адбывацца і да шостай гадзіны вечара.

Сэрца на сметніку ☞ 8

У Вялікай Бераставіцы кожны, хто хацеў, мог глядзець на астанкі святароў, якія валяліся на раскапаным прыцаркоўным пляцы. Рабочыя, з жыццёвай весялосцю і спакоем, закідалі іх землечарпалкамі на грузавікі і везлі праз горад, каб выкінуць на сметнік.

Родам з Беласточчыны ☞ 10

Старэйшаму беларускаму літаратару Уладзіміру Казберуку споўнілася 80 гадоў. Сур'ёзны юбілей. Таму, калі аглянуцца назад, дык ёсць што ўспомніць і прааналізаваць тое, што паспелася зрабіць, апублікаваць, выдаць. Крытыкаў і даследчыкаў літаратуры не так часта песцяць на старонках літаратурных выданняў, як, напрыклад, паэтаў...

Турнір гмін ☞ 11

Пры сонечным і цёплым надвор'і ў першую нядзелю верасня на стадыёне ў Міхалове адбыўся турнір Міхалоўскай, Гарадоцкай і Нарваўскай гмін. Людзі прыйшлі паслухаць песень у выкананні калектываў Міхалоўскай і суседніх гмін, а таксама музычнага калектыву „Свіслачане" з Беларусі.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Тоеснасць (не)рэгіянальная

[1 ☞ працяг]

яналістычным выступленням) патрабаваў устараніць са стратэгіі фармулёўку „tożsamość regionalna” і замяніць яе „tożsamością polską”.

— To jest kolokwializm, jaki narzucają nam struktury ponadnarodowe, — пераконваў перад галасаваннем над гэтай зменай, але безвынікова.

Неспадзеўкай у сваю чаргу было галасаванне над запісам у стратэгіі аб неабходнасці захавання канкрэтных чыгуначных ліній, перш за ўсё на шляху Беласток — Бельск-Падляшскі — Чаромха. Левая ўправа хацела яго замяніць агульным сцвярджэннем аб патрэбе захавання такіх ліній, калі будуць фінансавыя магчымасці. Што цікава, за першапачатковым запісам выказалася амаль аднагалосна апазіцыя, а кіруючая кааліцыя была супраць, сярод іх нават радныя, якія прадстаўляюць меншасныя асяроддзі — Ян Сычэўскі і Ян Зенюк.

У рамках інтэрпеляцый і пытанняў радны Зэнан Дзедзіц, дарэчы, пасля кантролю і невялікіх закідах Найвышэйшай кантрольнай палаты, вывеў новыя гарматы супраць „Пагранічча” ў Сейнах, якое галоўным чынам займаецца прапагандай культуры нацыянальных меншасцей. Намякаў ён на беспадстаўнае прысваенне назвы „Пагранічча”, бо, як тлумачыў, ад 20 гадоў мае яе ансамбль песні і танца ў Шыплішках (вядома, які прапаведуе слушныя, бо польскія традыцыі). Ашарашыла яго асабліва тое, што без водгуку засталася ягоная просьба, накіраваная члену ўправы Яну Сычэўскаму, дафінансаваць гэты калектыў.

— Я прасіў толькі 3,5 тысячы злотых, а меншасці на нейкія імпрэзы атрымліваюць па 20 тысяч! „Пагранічча” даюць 200 тысяч, а духавым аркестрам — нічога!

— Ну, што ж, я ведаю яшчэ некалькі ўстаноў у Польшчы, якія маюць у назве „Пагранічча”, — пракаментаваў выступленне Зэнана Дзедзіца віцэ-старшыня сейміка Адам Дабронскі (ПСЛ).

У сваю чаргу радная Альжбета Каўфман-Сушко мела прэтэнзіі да ўправы за тое, што не ангажавалася яна ў пілігрымку ў каталіцкі санктуарый у Святой Вадзе. Заклікала яна ахвяравацца на адну фігуру ў адной са станцый тамашняй Хрыстовай Крыжовай дарогі.

У другой частцы сесіі на нараду вынесены быў цікавы праект наконт магчымасці ўваходу Падляшша ў Еўрапейскую экалагічную сетку „Natura 2000”. Больш за 26% тэрыторыі рэгіёна (фаўна і флора) было б ахоплена асаблівай аховай Еўрасаюза. Памагаў бы ён фінансава ў захаванні прыроднага багацця м.інш. Даліны Ніжняга Буга, Верхняй і Ніжняй Нарвы, Даліны Бобры, Белавежскай пушчы. Усё гэта, аднак, пры ўмове некранання іх першабытнага характару. Болей пра гэта — у наступных нумарах „Нівы”.

Мацей Халадоўскі

Аб XIII Гаспадарчым форуме ў Крыніцы-Гурскай

4-6 верасня 2003 года беларуская дэлегацыя на чале з выконваючым абавязкі намесніка прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Сямашкам прыняла ўдзел у XIII Гаспадарчым форуме ў Крыніцы-Гурскай. У склад беларускай дэлегацыі таксама ўвайшлі прадстаўнікі міністэрстваў замежных спраў, эканомікі, энергетыкі, шэрагу беларускіх канцэрнаў, Пасольства Беларусі ў Польшчы.

Падчас знаходжання ў Польшчы адбылася сустрэча беларускай дэлегацыі з віцэ-прэм’ерам, міністрам эканомікі, працы і сацыяльнай палітыкі Польшчы Ежы Гаўснерам. У ходзе сустрэчы адбылося зацікаўленае абмеркаванне стану гандлёвых адносін Беларусі і Польшчы, наступстваў уступлення Польшчы ў ЕС, пытанні супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі і іншых сферах гаспадаркі. Бакамі была дадзена пазітыўная ацэнка дынамікі развіцця двухбаковых гандлёвых адносін.

Кіраўнік беларускай дэлегацыі таксама правёў сустрэчу з першым намеснікам міністра фінансаў Польшчы Веславам Цясельскім. У ходзе сустрэчы абмеркаваны магчымасці сумесней рэалізацыі шэрагу гаспадарчых праектаў, а таксама пытанні паглыблення супрацоўніцтва падатковых службаў дзвюх краін.

Беларуская дэлегацыя ў рамках форуму правяла сустрэчу з намеснікам старшыні Сейма Літвы Вуценісам Андрукайцісам. У ходзе гутаркі адбыўся абмен думкамі па пытаннях гаспадарчага, трансгранічнага і рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Літвы.

У. Сямашка выступіў у ходзе пленарнай сесіі форуму „Глабалізацыя і рынак працы”, у якой таксама прынялі ўдзел Е. Гаўснер і міністр эканомікі і еўрапейскай інтэграцыі Украіны Валерый Харашкоўскі. Падчас выступлення кіраўнік беларускай дэлегацыі прадставіў аналіз развіцця эканомікі Беларусі, выказаў падыходы ўрада краіны да працэсаў прыватызацыі, прыцягнення замежных інвестыцый, інавацыйнай дзейнасці.

Члены беларускай дэлегацыі прынялі ўдзел у шматлікіх семінарах у рамках форуму. Адбыліся размовы з кіраўнікамі дэлегацый шэрагу замежных краін, вядомымі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі Польшчы.

www.mfa.gov.by

Зразумелыя непаразуменні

Беларуска-расійскія інтэграцыйныя непаразуменні выйшлі на новы ўзровень. Цяпер ужо з вялікай доляй упэўненасці можна сказаць, што ўсё, аб чым напрыканцы мінулага года і ў пачатку гэтага дамаўляліся прэзідэнты абедзвюх краін, аказалася пшыкам. Па-меншай меры, на бліжэйшую перспектыву.

„Ніва” неаднойчы распавядала аб беларуска-расійскіх грашовых стасунках, агульная накіраванасць якіх нібыта ставіла на мэце аб’яднанне валют, а дакладней, увядзенне расійскага рубля на тэрыторыі Беларусі. І вось наступіў, што называецца, вырашальны момант. На прапанову Пуціна зрабіць усё магчымае, каб увесці расійскую валюту ў Беларусі з пачаткам 2005 года, Лукашэнка адказвае фактычнай адмовай. Сэнс выказванняў беларускага лідэра, якія ён агучыў спачатку ў Оршы, а потым у Давыд-Гарадку звёўся да таго, што, маўляў, беларускія рублі лепшыя, бо свае. Таму і пазбаўляцца іх нявартa. У афіцыйным жа лісце на прапанову расійскага прэзідэнта А. Лукашэнка зноў запатрабаваў першачарговага выканання ўсіх раней заключаных эканамічных і палітычных пагадненняў.

У выніку ў расійскага і беларускага бакоў выявіліся два падыходы да інтэграцыі. Расія, па ўсім відаць, хоча канкрэтыкі. Таму і прапануе ісці тым шляхам, які рэальна вядзе да фактычнага эканамічнага далучэння да яе Беларусі. Наколькі гэта шкодна для эканамічнага жыцця беларускай дзяржавы разгледзім ніжэй, а вось выгада для расійскага бізнесу і нязжытых імперскіх меркаванняў часткі расійскага насельніцтва — несумненная. Зразумела, калі кранацца чыста палітычных чыннікаў, то палітычная вага Пуціна, і без таго, дарэчы, не малая, яшчэ больш узрасце. Пры гэтым роля беларускага прэзідэнта істотна блякне і звыш таго ён губляе свой рэальны кантроль над адроджанай з савецкіх часоў камандна-адміністрацыйнай эканомікай. Зыходзячы з такога раскладу, зразумелымі становяцца „незалежніцкія” выказванні А. Лукашэнкі і ягонага атачэння, што суверэнітэт Беларусі для іх вышэй за ўсё. Хаця некалькі год раней вышэй за ўсё была інтэграцыя з Расіяй. Але і тут не ўсё так адназначна. Казаць аб тым, што А. Лукашэнка стаў вялікім незалежнікам і цалкам перайшоў на пазіцыі Зянона Пазьняка не вымагае. На чале сваіх інтэграцыйных памкненняў ён ставіць палітычны чыннік — прыняццё Канстытуцыйнага акта саюзнай дзяржавы. Пры гэтым яго не бянтэжыць, што пасля такога акта палітычны суверэнітэт Беларусі будзе падсечаны пад корань, а пры рэальным умацаванні данага „саюза” яна пераўтворыцца ў звычайную ўскраіну вялікага па тэрыторыі дзяржаўнага ўтварэння. Але зразумела, палітычнаму іміджу Лукашэнкі лаўры найвялікшага ўсходнеславянскага інтэгратара ўсіх часоў і народаў шкоды не нанясуць. А вось тады ўжо можна і, дарэчы, будзе папросту неабходна адзіная валюта, аб якую сёння так ламаюць коп’і беларускія і расійскія палітычныя вярхі.

Што ж тычыцца яе самой, а дакладней яе ўплыву на беларускую эканоміку, то тут варта прыслухацца да міжнародных эканамістаў, якія прадстаўляюць Міжнародны валютны фонд і ў пачатку верасня прыбылі ў Мінск для перамоў з беларускім урадам. Дарэчы, гэтыя перамовы маюць на мэце выдзяленне Фондам адмысловага крэдыту Беларусі, калі, зразумела, урад дакажа, што жадае ісці шляхам рынкавых пераўтварэнняў. Па меркаванні прадстаўніка МВФ Джона Олдынга-Смі, „і грашовы саюз з Расіяй, і захаванне нацыянальнай валюты могуць працаваць дастаткова добра пры ўмове, што эканамічная палітыка будзе дзейнічаць у падтрымку прынятага рашэння”. Адным словам, калі беларускія ўлады пачнуць рынкавыя пераўтварэнні, дадуць рэальную свабоду прадпрымальніцтву, знізяць кошты і падаткі, утаймуюць інфляцыю, якая найвышэйшая на постсавецкай прасторы, то якімі паперкамі будуць разлічвацца грамадзяне ў магазінах не надта і важна.

З усяго вышэйадзначанага выцякае, што размовы аб грашовай інтэграцыі, якая зайшла ў тупік, як, дарэчы, і стварэнне адзінай газатранспартнай сістэмы хаваюць пад сабой адно пытанне — палітычную будучыню дзеючага беларускага прэзідэнта. І хутчэй за ўсё, менавіта аб ёй пойдзе гаворка на будучых сустрэчах апошняга з расійскім і ўкраінскім калегамі напярэдадні саміта прэзідэнтаў СНД у прычарнаморскім горадзе Ялта.

Уладзімір Лапцэвіч

Аб падрыхтоўцы беларускага боку да ўвядзення з 1 кастрычніка 2003 г. візавых адносін паміж Рэспублікай Польшча і Рэспублікай Беларусь

З 1 кастрычніка — візы

З 1 кастрычніка 2003 г. Польшча ўводзіць візы для грамадзян Беларусі.

26 жніўня ў Мінску было падпісана Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Польшча і Урадам Рэспублікі Беларусь аб узаемных паездках грамадзян.

Мэтай пагаднення з’яўляецца спрашчэнне парадку паездак грамадзян Польшчы і Беларусі ва ўмовах абавязваючага з 1 кастрычніка 2003 г. візавага рэжыму. Падпісанае пагадненне прадугледжвае ўрэгуляванне ўмоў узаемных падарожжаў для паасобных катэгорый грамадзян абедзвюх краін.

З 1 ліпеня 2003 г. беларускі бок падрыхтаваны да дзейнасці ва ўмовах абавязвання візавага рэжыму.

З 1 ліпеня працуе новая консульская ўстанова Беларусі ў Польшчы — Консульства ў Белай-Падляшскай.

У новыя сядзібы перасяліліся ў пачатку красавіка г.г. Генеральнае консульства ў Беластоку і Генеральнае консульства ў Гданьску.

Усе консульскія ўстановы аснашчаны неабходным сучасным абсталяваннем, у тым ліку камп’ютэрным. Выразна павялічыўся штат консульскіх работнікаў.

Цяпер за беларускімі візамі можна ў Польшчы звяртацца ў ніжэйпералічаныя консульскія ўстановы:

— Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку,

— Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Гданьску,

— Консульства Рэспублікі Беларусь у Белай-Падляшскай,

— Консульскае аддзяленне Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве.

Прэс-бюлетэнь Пасольства РБ у РП

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Калектыў „Арэшкі” з дажынкавай перапяліцай

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

З хлебам і соллю войта Юрыя Васілюка віталі Ян Адамчук і Валянціна Ціханюк

З перапяліцай у Чыжах

На V Сустрэчах з дажынкавым абрадам, якія 31 жніўня адбыліся ў Чыжах, удзельнічалі калектывы з Гайнаўшчыны і Беларусі. Прыехалі і прыйшлі сяляне з Чыжоўскай і суседніх гмін. Зараз у суседніх гмінах перасталі арганізаваць дажынкавыя ўрачыстасці, якія раней праводзіліся пад партыйным кіраўніцтвам. У Чыжах вярнулі ранейшую традыцыю.

Дажынкі пачаліся малітвамі. Члены калектываў з Чыжоўскай гміны разам з войтам Юрыем Васілюком і прадстаўнікамі сялян занеслі дажынкавыя вянкі разам з хлебам і соллю ў царкву. Пасля Літургіі адслужаны быў малебен. Айцец Іаан Раманчук асвяціў прынесеныя плёны і на беларускай мове падзякаваў гаспадарам за працу.

Галоўныя святкаванні адбыліся побач вясковай святліцы. Спадарожнічала ім выстаўка плёнаў сабраных у Чыжоўскай гміне. Можна было паглядзець велізарную дыню, прывезеную з Курашава, гародніну і сёлетняе збожжа. Геронім Панятоўскі, кіраўнік Гайнаўскага аддзялення Сельскагаспадарчага дарадчага асяродка патлумачыў, што цяпер экспанаты не пазначаны прозвішчамі, каб не ўзнікнулі прэтэнзіі наконт правільнага вылучэння гаспадароў. Паінфармаваў ён, што сёлетні ўраджай ярай пшаніцы быў добры. Намнога горшы прыбытак быў ад азімай пшаніцы. Павымярзала яна і часткова засохла. Сталі мы гаварыць аб пшаніцы, бо землі ў Чыжоўскай гміне пшанічна-бурачаныя, адны з самых лепшых у Падляшскім ваяводстве.

— Дождж пайшоў і буракі сталі адпівацца. Толькі на бульбу ўжо позна. Папрысыхала, — заявіў Ян Пліс з Шастакова, які дапамагае сыну ў гаспадарцы. — Цяпер няма такога прыбытку, які быў раней. Малако вельмі таннае. Калі хто прадасць за месяц больш за 3 тысячы літраў, то заплацяць яму па 60 грошаў за літр, а калі менш — заплацяць па 50 грошаў за літр.

Яўген Заброцкі, які гаспадарыць на 130 гектарах зямлі ў Збучы, паінфармаваў, што яго азімая пшаніца была горшай за мінулагоднюю на 30%.

— Калі б сабраў прынамсі па 5 тон пшаніцы з гектара, то прыбытак быў бы. Аднак сёлета атрымалася горш. Буракі вялі, але пасля апошніх дажджоў ажылі, — паясніў Яўген Заброцкі. — Увогуле слабая прыбытковасць ад прадукцыі збожжа. Увесь час даражэе паліва і сродкі аховы раслін, а цэны на збожжа засталіся на тым самым узроўні, што ў мінулых гадах.

Яшчэ перад прыходам гаспадароў і гасцей дажынак з царквы солтыс Андрэй Ціханюк і кіраўнік Гміннага асяродка культуры Юрый Якімюк наглядалі за падрыхтоўкай да ўрачыстасці.

— Хаця некаторыя супраць нашых святкаванняў, я за арганізаванне дажынак. Пасля цяжкай працы трэба развесяліць душу. Можна падзякаваць Богу за ўраджай і пабачыць, якія плёны былі сёлета, — заявіў солтыс. Побач выстаўкі плёнаў распаўсюджваліся рэкламныя матэрыялы і кніжкі Касы сельскагаспадарчага грамадскага страхавання, а яе працаўнікі арганізавалі конкурс па знаёмстве з бяспечнай працай. Віктар Швед і Міхась Хмялеўскі падпісвалі свае кніжкі.

Карагод з дажынкавымі вянкамі вярнуўся з царквы са спевам. Вянкі выканалі працаўнікі Гміннага асяродка культуры ў Чыжах і члены калектываў „Незабудкі” і „Збучанкі”. Першымі ў час артыстычнай часткі выступілі „Арэшкі” з Арэшкава. Прывезлі яны з сабой „перапяліцу”, прыбраную кветкамі, з якой выступалі на сцэне.

— Перад дажынкамі рыхтуем перапяліцу, пакідаем хлеб для зайчыка і спяваем дажынкавыя песні. Пасля з перапяліцай ездзім па дажынках, — сказала спадарыня Скепка з Арэшкава. Войта Юрыя Васілюка прывіталі з асвячоным хлебам і соллю адны з самых лепшых гаспадароў — Ян Адамчук і Валянціна Ціханюк. Ад „Арэшкаў” атрымаў ён таксама хлеб з сёлетняй мукі.

— Дзякую за гэты прыгожы і шчодры дар. Каб хлеб мог гасцяваць на нашых сталах, патрэбная вялікая праца ўсіх гаспадароў. Я з усіх сіл буду стараццa, каб гэты Божы дар дзелены быў мудра і справядліва. Так, каб хлеба хапіла на кожным вясковым стале, а нам усім жылося шторaз лепш, — заявіў войт Юрый Васілюк. Прывітаў ён сабраных як арганізатар мерапрыемства. Дзякаваў суарганізатарам, якімі былі Галоўнае праўленне БГКТ, Гмінны асяродак культуры ў Чыжах, Чыжоўская праваслаўная парафія і Рада вёскі Чыжы. Сярод гасцей прысутны былі старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі і сакратар ГП Валянціна Ласкевіч, якая наглядала за выступаючымі хорамі, старшыня Беларускага самаўрадавага форуму ў РП Міхась Андрасюк, гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук і кіраўнікі павятовых сельскагаспадарчых адзінак. Перад сабранымі выступілі жанчыны з Курашава, „Чыжавянe”, „Збучанкі”, хор Гайнаўскага дома культуры і госці з Беларусі. Моладзь Гродзенскага Вучылішча мастацтваў выступіла перад публікай з народнымі беларускімі танцамі, а Ансамбль народнай песні „Ярыца” з Мастоў прадставіў апрацаваныя беларускія песні. Пасля выступлення калектываў жыхары Чыжоўскай гміны гасцявалі і адпачывалі. Да танцаў іграў ім гурт „Аксель” з Нарвы.

Аляксей Мароз

Дажынкі ў Залуках

Вёска Залукі Гарадоцкай гміны знаходзіцца ў маляўнічай ваколіцы над рэчкай Супраслю. Яна — быццам цэнтр навакольных вёсак, адкуль прыводзяць дзяцей да мясцовай школы, якую ўзначальвае Катажына Філіпчык. Жыве тут больш моладзі і дзяцей чым у іншых вёсках. У Залуках людзі працавітыя, добрыя, дружныя і таленавітыя. У вёсцы існуе мастацкі калектыў „Каліна”, арганізатарам і душой якога з'яўляецца Валянціна Паплаўская, а мастацкім кіраўніком — Віктар Леанкевіч. Гэтую функцыю выконвае ён і ў маладзёжным гурце „Калінка”.

На 6 верасня запланаваны былі ў Залуках гмінныя дажынкі. Між іншым з гэтай нагоды залучане пры дапамозе гмінных улад на вялікім школьным пляца пабудавалі амфітэатр са сцэнай і дахам над ёю. Умела выкарыстаны быў рэльеф пляца, зроблены падмурак, пастаўлены снапкі збожжа, кветкі.

На дажынкі прыбылі прадстаўнікі мясцовых улад і ўстаноў, госці з Беластока, у тым ліку віцэ-консул РБ Аляксандр Харытонаў, святары з Міхалова, Каралёвага Моста і Гарадка. Усе яны разам з мясцовым царкоўным актывам і дзецьмі прывіталі епіскапа Беластоцка-Гданьскай епархіі Іакава, прысутнасць якога на дажынках была вялікай падзеяй у гісторыі Залук. Затым на сцэне служылася набажэнства, у час якога ўладыка Іакаў супольна з каталіцкім ксяндзом пасвянціл хлеб і снапкі, якія знаходзіліся каля амфітэатра. А далей былі прамовы з падзякай сялянам за цяжкую працу. Выказалі яе каталіцкі ксёндз і епіскап Іакаў (на польскай мове). Калі святары зышлі са сцэны, распачалася цырымонія ўручэння бохана хлеба і вянкоў войту Гарадоцкай гміны Веславу Кулешы. Пасля з кароткімі прывітальнымі прамовамі выступілі войт В. Кулеша, старшыня Гміннай рады ў Гарадку Крыстына Клімкевіч і старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі.

— На жаль, успомнены бохан хлеба дзеліцца несправядліва. Адным яго аж замнога, а другія хлеба не маюць. А гэта таму, што вельмі ў нас многа хітруноў, камбінатараў, часта займаючых высокія дзяржаўныя пасады, — адзначыў Ян Сычэўскі.

Далей кіраўніком на сцэне была сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч. Яна інфармавала аб дасягненнях калектываў і запрашала на эстраду. І паплылі мелодыі:

Касенька ты мая напаі каня
Я каня паіць не буду, бо я жонка не твая.

Гэта словы песні з рэпертуару мясцовага калектыву „Каліна”. Пасля спявала моладзь з „Калінкі”. Публіцы асабліва спадабалася „Удзячная памяць нашчадкаў”. Нядрэнна адрэкамендавалася таксама танцавальная група „Калінкі”.

З Гарадка выступілі чатыры калектывы: „Расспяваны Гарадок” (музычны кіраўнік Віктар Маланчык, а арганізацыйны — Ніна Цыванюк), „Асенні ліст” (мастацкі кіраўнік Юрка Астапчук), капэла (кіраўнік Янка Карповіч) і „Прымакі”. Чарговымі калектывамі былі „Сакрэт” з Міхалова, „Крыніца” і „Лучына” з Беластока.

„Лучына” — зусім малады калектыў, які паўстаў некалькі месяцаў таму і ўжо паказаў даволі добры ўзровень. Удзельнікі хору і музыканты гэта ў асноўным студэнты. Перад ім можа быць вялікая будучыня, калі ў яго знойдзецца дастаткова творчай сілы і настойлівасці ў дасканаленні ўсіх фактараў песеннага і музычнага мастацтва. „Лучына” мае ўсе неабходныя атрыбуты, каб у хуткім часе стаць адным з найлепшых беларускіх артыстычных калектываў. Арганізаваў гэты студэнцкі гурт Дарыюш Грыбок, а мастацкім кіраўніком з'яўляецца маладая, таленавітая Гражына Валкавыцкая.

Моцнымі апладысментамі ўзнагароджвала дажынкавая публіка кожны нумар праграмы ансамбля песні і танца „Грымата” са Слоніма з Беларусі, які працуе пад мастацкім кіраўніцтвам Валянціны Шыронавай. Дасканалыя, захапляючыя выступленні ўзрушалі прысутных. Вельмі добра, што госці з Беларусі, этнічнай нашай Радзімы, успамагаюць мерапрыемствы Беларускага таварыства сваімі выступленнямі, бо гэтым павышаюць іх ранг. „Грымата” спявала яшчэ падчас вячэры, на якой былі выступленні, тосты, сардэчныя размовы, і трошкі „разговорнай” вады.

Залуцкім дажынкам спадарожнічалі таксама літаратурна-забаўляльныя мерапрыемствы. Аматары прыгожага пісьменства маглі купіць кніжкі, у тым ліку паэтычныя зборнікі з аўтографам Віктара Шведа, а паклоннікі беларускіх песень — аўдыёкасеты з запісамі папулярных на Беласточчыне гуртоў. Вечарам пачалася забава для моладзі.

Напрацаваліся залучане разам з Валянцінай Паплаўскай нездарма, бо дажынкавае свята прайшло вельмі ўдала — проста дасканала — за што ім і гмінным уладам у Гарадку належыцца шчырая падзяка.

Міхась Хмялеўскі

Цень Садама

Два месяцы таму, калі амерыканцы аб'явілі свету пра сваю перамогу над іракцамі, журналісты і палітыкі ў Польшчы разняволіліся ад шчасця, што такога магутнага саюзніка прыдбала наша краіна. Калі прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі пасылаў салдат на арабскую зямлю, нават радыкальныя апазіцыянеры са зразуменнем успрымалі ягонае рашэнне. Тым часам, паводле сацыялагічных даследаванняў, амаль восемдзесят працэнтаў палякаў не адобрыла агрэсіі на Ірак і акупацыі тае краіны амерыканскімі, англійскімі і польскімі войскамі. Але пра тое, што думала грамадства краіны, незалежная прэса, радыё і тэлебачанне маўчалі.

Неўзабаве высветлілася, што ў Іраку няма нават следу зброі масавага знішчэння. Гэтую справу амерыканская і польская прапаганда прадстаўляла як галоўную прычыну агрэсіі на Ірак. У Амерыцы нешта зварухнулася. Вялікай колькасці грамадзян тае краіны стала зразумелым, што прэзідэнт Буш ашукаў іх. Падтрымка прэзідэнту пачала хутка падаць. Пры тым кожнага дня з Ірака плывуць весткі, што нехта страляе да амерыканскіх салдат, якія прынеслі вызваленне ад жахлівага дыктатара. Вызваленыя тым часам замест кветак кідаюць на вызваліцеляў бомбы.

Паводле амерыканцаў, каб кантраляваць Ірак, трэба мець 400 тысяч салдат і паліцыянтаў. Сёння амерыканцы разам з саюзнікамі маюць іх напалову менш, але і гэтага не ў змозе ўжо вытрымаць бюджэт краіны. Разлічвалі яны на дармовую нафту, сыравіну, якая кампенсавала б кошты вайны. Сваю акупацыю назвалі нават „місіяй адбудовы Ірака". Арабы, аднак, пастаянна перашкаджаюць рэалізаваць такі план, знішчаючы, напрыклад, нафтаправоды. Апошнім часам амерыканцы пачалі разглядацца як прыдбаць міжнароднае адабрэнне для акупацыі Ірака. Абазначае гэта, што трэба было б дзяліцца здабычай з французамі, немцамі, а можа нават з расіянамі. Гэта была б сапраўдная палітычная катастрофа адміністрацыі Буша. На вайну і акупацыю амерыканцы патрацілі ўжо сотні мільярдаў долараў, нажылі фанатычных ворагаў з ліку арабаў, не ўспамінаючы пра загінуўшых салдат. Яны прынамсі шукаюць выхаду з бязвыхаднай сітуацыі.

У Польшчы выпадкова дапусцілі да мікрафона аднаго з апошніх сумленных палітыкаў Яцка Кураня, які пры першай нагодзе сказаў, што ўдзел палякаў у агрэсіі і акупацыі Ірака гэта ганьба для краіны і арміі. Наступнага дня прэзідэнцкі міністр, здаецца, першы мілітарыст краіны, Марэк Сівец, апраўдаў палітыку свайго шэфа словамі, што палякі маюць гонар змагацца за супольную справу разам з амерыканцамі. Не адказаў аднак за якую справу, важную для Польшчы, змагаюцца ў Іраку польскія салдаты.

Самы вышэйшы ўзровень падлізніцтва „вялікаму брату" прадэманстраваў галоўнакамандуючы польскай дывізіяй у Іраку генерал Тышкевіч, калі стоячы перад амерыканскім міністрам абароны Доналдам Рамсфелдам абяцаў выконваць усе задачы „так як вучылі нас прафесары з *мэрыс*". Усё паказвае, што неўзабаве ў школьных падручніках удзел у акупацыі Ірака будзе чарговым доказам змагання палякаў „за нашу і вашу свабоду".

У тэлебачанні тым часам паказваюць шчаслівых вайскоўцаў і іракцаў. Афіцэры на базары купляюць акуляры. Арабы ўсміхаюцца, салдаты ловяць рыбу, пішуць лісты. Часам на пытанне пра праблемы нехта адкажа — не хапае халоднага піва. Раней такі вобраз можна было пабачыць на нямецкіх кінастужках пераднага другой сусветнай вайны ці ў рэпартажах з савецкай „інтэрнацыяналістычнай місіі" ў Афганістане.

Галоўны герой вясны гэтага года — Садам Гусейн — час ад часу пасылае свае прамовы ў СМІ арабскіх краін, заклікае да змагання з акупантамі, пагражае амерыканцам і іх саюзнікам тэрорам на тэрыторыі іх краін. Невядома нават ці гэта голас былога дыктатара, але кожная яго балбатня робіцца прадметам аналіз, дыпламатычных і прэсавых спекуляцый. Побач Бен Ладэна над светам пачынае, як спутнік, кружыць цень Садама Гусейна. Раней было вядома дзе знаходзіцца і чым займаецца гэты састарэлы дыктатар, цяпер явіцца ён як віртуальнае зло, якое невядома калі і дзе матэрыялізуецца ды нешта знішчыць на зямлі. Садам Гусейн і Бен Ладэн — вынікі амерыканскай палітыкі, таксама непрадбачлівыя, як вынік эксперыментаў доктара Франкенштэйна. Для іракцаў нават існаванне ці не існаванне дыктатара не мае сёння вялікага значэння. Заўсёды былі там нейкія садамы гусейны, з'яўляліся элементам тамашняй палітычнай традыцыі. Сёння ў арабскім доме з'явіліся няпрошаныя госці. Гэта самая вялікая іх праблема. Прысутнасць акупацыйных войскаў таксама неўспрымальная як палякам царская ўлада ў Варшаве. І нават калі свая дзяржава, незалежная Польшча, прымушала плаціць амаль у дзесяць разоў вышэйшыя падаткі, ніхто не сумаваў па расійскай адміністрацыі. Не будзе спакою ў Іраку пакуль апошні салдат акупацыйных армій не пакіне арабскай зямлі.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Фантазіі Кшыштафа Скібы

Розныя аповеды давялося мне пачуць у час падарожжаў па Польшчы аб усходняй сцяне, асабліва аб той яе частцы, якая сёння называецца Падляшскім ваяводствам. Калі ў сваё юнацтва трапіў я ў адну бацаўку ў час вандроўнага лагера па Нізкім Бэскідзе, адна старэйшая гуралька, калі на пытанне „адкуль вы самі будзеце" пачула, што з Беластока, адказала з наіўнай грацыяй: „А-а-а, гэта адтуль, дзе ходзяць белыя мядзведзі!". Я аслупянеў, і, вядома, маё пачуццё мясцовага патрыятызму было моцна зняважанае, хоць сёння я нічога не меў бы супраць белых мядзведзяў у сталіцы нашага рэгіёна, асабліва калі б хапалі ды пажыралі дурняў, якія ўсюды знюхаюць жыдоўскую ці беларускую змову.

Іншым разам, калі я ўжо крыху пастарэў, у Драматычным тэатры імя Аляксандра Вянгеркі ў адну з галоўных роляў у „Праметэі" паводле Ежы Анджэеўскага была запрошана Галіна Мікалайская, вядома гданьская актрыса, якая тады (раннія васьмідзесятыя) была на чорным спіску ўлады за падпольную апазіцыйную дзейнасць. Перад адной з рэпетыцый дайшло да страляніны ў адной з кавярняў у цэнтры Беластока. Наколькі памятаю, юнак застрэліў сваю нарачоную ды канкурэнта, з якім тая фліртавала. Акцёры не маглі засяродзіцца на „Праметэі" і быццам сіпы наўкол выгарэлага на сонцы цела прытарочанага да скал Каўказа, кружлялі выключна наўкол аднолькава драматычнай сцэны зайздрасці ў кафе. Мала гэта цікавіла гданьскую актрысу. Урэшце, не сцярпела яна і прамовіла з грацыяй: „Ну, што ж — Беласток — Далёкі Усход".

І такія розныя аповеды на тэму гэтай нашай Усходняй сцяны кружылі нават і ў дзевяностыя гады. Сумнага, а часам і ўяўнага адлюстравання не змяніў нават спецыяльна назначаны прэм'ерам Владзімежам Цімашэвічам яго паўнамоцны — Анатоль Вакулюк. Прыгадаў я ўсё тое, калі трапіў у мае рукі адзін з апошніх нумароў тыднёвіка „Wprost". Ягоны пастаянны фельетаніст, папулярны асабліва сярод маладых, музыка Кшыштаф Скіба апублікаваў там тэкст пад інтрыгуючым загалоўкам „Najt rower". Загаловак, як гэта адзначыў аўтар, навінка на рынку экстрэмальных відаў спорту. Скіба піша: „Гэты від спорту — язда на ровары ноччу без святла. Ад спаборнікаў патрабуе адно халоднай крыві, сакалінага зроку і абсалютнага браку інстынкту самазахавання (...) Сёння гэта самы папулярны від спорту на г.зв. Усходняй сцяне (...). Спаборнік выхінаецца заўсёды ў апошнюю хвіліну, ледзь пару метраў перад лабавым шклом машыны. Момант сустрэчы са змрочным веласіпедыстам — незабыўны! Знаўцы сцвярджаюць, што гэта крыжоўка аргазму з катарзіс (...). Апрача распаленых малалетак ёсць і сеніёры, якія часта спантанна пабольшваюць ступень цяжкасцей, едучы на ровары не толькі без святла, але і ўзяўшы добрую чарку".

Цяжка не пагадзіцца з Кшыштафам Скібам, калісьці сааўтарам студэнцкай газеткі „Przegięcie pały" і ўласнікам аўто з малюнкам „Fantasia a la polacca", што з'ява перамяшчання пасля зморку падвыпіўшых ездакоў на іхных павозках без ляпмачак гэта праўда. Толькі што — не новая яна, а з традыцыяй у пару дзесяткаў гадоў, да таго агульнапольская, а нават і замежная. Гэта не спецыяльнасць і не нейкая асаблівасць Усходняй сцяны. Насуперак таму, што піша К. Скіба, не ў ваколіцы Беластока сталіца таго *найт-ровара*, бо ў такое з'явы няма сталіцы. Хопіць праехацца ноччу па мясцінах наўкол роднага Скібе Гданьска ці блізкай яму з часоў студэнцтва Лодзі. Прыкмеціць такую грамадскую з'явую было няцяжка аўтару фельетона ва „Wprost", урэшце ж, выпускніку культуразнаўства і ў свой час жыхару студэнцкага інтэрната, што стаяў не абы-дзе, а па вуліцы Лумумбы. Відаць, здарылася „штосьці" пры ўдзеле таго фельетаніста, што паўплывала на тое, што тую з'яву звочыў якраз тут, у нас. Успрыманне Скібам рэчаіснасці крыху прыгадвае мне размову ў адным з моладзевых месячнікаў са, здаецца, блізкім яму, выклікаючым шмат эмоцый, скажам, дзеячам музычнага руху, Кубам Ваяводскім. На пытанне, колькі каштуе папулярная рыбна-перцавая кансерва, той сказаў: „Пэўна, злотых 17".

Кшыштаф Скіба — як кажа мая адна сяброўка-найтвеласіпедыстка, дарэчы, не з ваколіц Беластока, а з самой беластоцкай метраполіі (прабываючая, дарэчы, ад нейкага часу ў Нью-Йорку) — адарваны плугам ад зямлі. Але гэта ён між іншым фармуе агульнапольскую думку аб Усходняй сцяне, Беластоку — тым Далёкім Усходзе, па якім валэндаюцца белыя мядзведзі.

Мацей Халадоўскі

Яшчэ пра Курскую бітву

Адгалоскі

У артыкуле „Пераломная бітва" („Ніва" № 32 ад 10.08.2003 г.) Яўген Мірановіч учыніў тры недакладнасці.

1. Перш за ўсё, насамрэч, бітва трывала не „ўвесь месяц", а працягвалася ад 5 ліпеня ажно да 23 жніўня 1943 г., г.зн. больш як паўтара месяца.

2. Гэта не савецкая разведка паставіла дакладныя інфармацыі „аб стане падрыхтоўкі немцаў і пачатку... аперацыі", а сетка прасавецкіх шпіёнаў у Швейцарыі, якая мела „штэпселя" г.зн., свайго чалавека ў гітлераўскім генштабе.

3. Аўтар перабольшыў лік танкаў па абодвух баках фронту, бо не было гэта — як ён піша — 9 тысяч, калі „Энциклопедический словарь" (Москва 1954) напісаў, што немцы мелі 3 тысячы танкаў, 3 тыс. гармат, 3 тыс. мінамётаў і амаль 2 тыс. самалётаў.

Каб вычарпаць тэму — прынамсі на ўзроўні агульных энцыклапедый — трэба дадаць наступныя факты.

Калі Гітлер рашаў, ці рабіць контрнаступленне, ён прызнаўся сваім генералам, што ён гэта зробіць, хаця ўсе яго „кішкі становяцца дыбам". Галоўнай мэтай бітвы было знішчыць Чырвоную Армію і акружыць Маскву.

Ведаючы дзень пачатку бітвы, савецкі бок апярэдзіў нямецкую атаку і абрушыў шквал агню з усіх ствалоў на пярэдні край ворага. Крыху шкоды нарабіў, але бітва ўсё роўна пачалася.

Немцы ўсё-такі фронт прарвалі пад Белгарадам і іхнія танкі дайшлі да сяля Прахораўка. Тады стаўка ў Маскве выслала праз генерала (самалётам) загад генералу Ротмістраву, які са сваімі рэзервамі танкаў стаяў далёка на ўсход ад фронту, каб выручаў. Пасабіў з паўночнага захаду і Варонежскі фронт. Прарыў не толькі быў ліквідаваны, але Чырвоная Армія вызваліла гарады Харкаў, Белгарад і Арол.

З той пары гітлераўцы не зрабілі ўжо ніводнага контрнаступленне, а фронт ад Вялікіх Лукаў да Чорнага мора стаў каціцца безупынна на захад. Сталін сказаў „Если битва под Сталинградом предвещала закат немецко-фашистской армии, то битва пад Курском поставила её перед катастрофой".

У Курскай бітве галоўнай часткай нямецкай арміі былі танкавыя дывізіі фельдмаршала Манштэйна — самага вялікага гітлераўскага стратэга. Каб зрабіць дэзінфармацыю, г.зн. увесці ў зман савецкую стаўку перад пачаткам аперацыі „Цытадэль" ён быў высланы ў Румынію.

Гераізм савецкіх танкістаў быў сапраўды вялікі, бо часта бывала, што „ўсходні" танк таранаваў нямецкую машыну, каб яе скрышыць і разам з ворагам... згарэць. Вечная ім памяць! (рг)

Мікола Гайдук

Мроі (3)

(працяг; пачатак у 36 н-ры)

Сабраўся і паехаў у Холм, пакінуўшы на падмогу раненаму Цюйме соцкага з двума дзесяткамі вояў.

І павалакліся распаленыя гарачкай, спавітыя соннымі трызненнямі і ўяўнымі падзеямі дні, тыдні, месяцы. Цюймава маладое цела доўга і натужліва змагалася са смерцю. Толькі недзе праз год наступіла канчатковая перамога жыцця, і гэта дзякуючы дзіўным лекаванням старога Шугая, які рознае зелле ды настойкі спачатку выпрабоўваў на сваёй раненай назе, а потым ужо прыкладваў да Цюймавага гніючага боку.

Падобна як пасаднік, так і горад вельмі павольна вяртаўся да жыцця: князь падкінуў сюды крыху ўзгорскіх і палавецкіх нявольнікаў, але рамесны люд у драгічынскі пасад не спяшаўся — пужала яго пагрозлівае суседства Літвы. Па Бугу на многа радзей, чым калісьці, плылі цяжка нагружаныя камягі, значна часцей жа шыбавалі звітныя чаўны з пасланцамі ды воямі.

Але Цюйму, стаячага на крапасной сцяне, менш цікавіла пакручастая і вірыстая магутная рака. Ён пераважна кіраваў свой зрок у процілеглы бок, на поўнач, дзе за насупіўшай кашлатыя бровы адвечнай пушчай пакутвала ў літоўскай няволі яго Чарнушка. Цяпер яна явілася яму з немаўляцем на руках. І Цюйма ўздрыгваў: „А можа ж так быць, — упэўніваў ён сябе. — Мы ж спадзяваліся дзіцяці, спадзяваліся сына...” І яму ставалася млосна. Ён спускаўся з крапасной сцяны, прыходзіў у святліцу і кулём валіўся на ложа. Сатканая са здагадак мроя не адыходзіла, яна набліжалася, станавілася яскравай, жывой. Карыя вочы Чарнушкі з дакорам глядзелі з глыбокіх ад холаду і гора цёмных вачных ямаў на выхудзелым твары, а заморанае дзіця працягвала ў яго бок свае тоненькія і жоўценькія, бы саломінкі, ручкі, нешта лепятала сінімі ад малакроўя губкамі...

І цягнулася такое з ночы ў ноч, тыднямі, месяцамі, гадамі.

На самай справе дык за ўсе гэтыя тры гады прабывання ў жмудскай няволі Чарнушка нават не прыгледзелася, як належыцца, свайму ўладарніку — вашпану, да гурту нявольнікаў якога яна належала. І не дзіва: баярын Перпуоліс вельмі рэдка паяўляўся ў сваім кемасе-двары Віршунях, што знаходзіўся вярстах у трох ад Коўна. А калі і прыязджаў, то на адзін-два дні і зараз жа знікаў.

Наглядчык за нявольнікамі, стары Раўдас, калі завязвалася асцярожная гаворка пра вашпана, перш за ўсё заўважаў, што не чэрні гэта справа пляткаваць пра свайго ўладальніка. Маюць жа яны вызначаную работу, дык няхай пільнуюць яе, бо за лішнюю цікаўнасць можна і сабачай скуры паспытаць. І пры гэтым ён шматзначна намацваў рукою канчук, што тырчэў за крайкаю-поясам у яго на жываце. Нявольныя спынялі гаворку, жвавей завіхаліся каля работы. Раўдас жа расплываўся ні то ва ўласных успамінах, ні то ў пахвале вашпану. Слаўны баярын Перпуоліс, маўляў, не мае часу сядзець з бабамі ў хаце. Ён — правая рука вялікага Трайдэна, князя ўсяе Літвы. І калі не ў сядле, ходзячы з ім за Днепр, на Русь, за Буг, у Мазовію ці супраць крыжакоў, тады ў княжацкай цвердзі ў Навагрудку чыніць з ім вялікую раду пра тое, як ворагаў перамагчы, дабычу сабе і дружыне прыдбаць і межы сваіх уладанняў расшырыць.

У такі час вандруе са шчодрых рук князеўскіх у верныя рукі баярскія каваны золатам турыны рог, з настоеным на розных зеллях духмяным мэдусам. І ліецца тады з вуснаў пабеленага сівізною жраца-вайдалёты песня-дайна пра даўнія паходы і мужныя ўчынкі колішніх вояў. Доўга за поўнач цягнецца мужчынская бяседа, даспяваюць у часе яе планы будучых паходаў, у грыдзяў загараюцца вочы прагавітым агнём ды свярбяць рукі да мяча і суліцы. А калі ўсмажлівы і сухі канец лета пракладвае сцежы праз лясныя крэкаці ці марозная зіма высцілае скрозь гладкі гасцінец, ад кемаса ў кемас маланкаю вандруе кліч-віці і праз некалькі дзён хвацкая дружына ўжо стаіць у вызначаным на збор месцы. Вайдалёта чыніць ахвяру багам на вялікім плоскім камені пад разгаліністым дубам, а воі ў тым часе па выглядзе неба ды подзьмухах ветру згадваюць, што іх чакае ў паходзе.

І ў гэтым месцы неяк сціхаў, забываўся стары Раўдас. І не выпадкова, бо хоць тады варожбы не пагражалі нічым дрэнным, а вось недзе пад Чарнігавам, яны наткнуліся на мясцовых дружыннікаў. Бой быў кароткі, але жорсткі. Малады вой наскочыў на Раўдаса нечакана. Відаць, быў ляўшою: секануў па правай руцэ. Праўда, Раўдас выйшаў з бою жывым, але замест рукі ў яго тырчэў абкручаны шматкамі абрубак. З таго часу і стаў ён каратаць свой век нахлебнікам у вашпана. Спачатку ў пасыльных хадзіў, а як крыху састарыўся, прыставілі яго да нагляду за нявольнікамі. Усе ведалі пра гэта, і калі бязрукі вой замаўкаў, патанаючы ў сваіх цяжкіх успамінах, стараліся не вырываць яго з забыцця. Мо проста спачувалі яго жыццёвай няўдачы. Як-ніяк, але па сутнасці чалавек ён быў добры: хоць крыку рабіў многа, ды канчук рэдка калі з уласнай волі пускаў у ход.

(заканчэнне будзе)

З новымі сіламі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дырэктар Васіль Ляшчынскі

Да новага школьнага года ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім вучні і настаўнікі прыступілі з новымі сіламі. Яшчэ ў час канікулаў праведзены быў рамонт большасці залаў і гаспадарчых памяшканняў. Работнікі адрамантавалі і памалявалі вокны. На рамонты школа атрымала з гарадскога бюджэту толькі 10 тысяч злотых. Большасць грошай выдаткавала з бацькоўскага камітэта і ўласных сродкаў (каля 12 тысяч злотых).

Распачало вучобу ў „тройцы” звыш 920 асоб, якія будуць займацца ў 36 класах. Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы з'яўляецца адзінай школай у Бельску-Падляшскім, у якой расце колькасць вучняў. Паколькі ў школе толькі 23 класавыя залы і няма грошай на разбудову школьных будынкаў, вучоба будзе адбывацца і да шостай гадзіны вечара.

— У гімназію прыйшлі таксама вучні, якія ў падставовай школе не вучыліся беларускай мове. Хочам, каб яны ўзроўнем валодання беларускай мовай дараўнялі да іншых вучняў. Таму арганізуем ім на працягу першага класа дадатковую гадзіну вучобы беларускай мове, — паінфармаваў дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Аднак у нас мала дапаможнікаў да навучання роднай мове. Мала відэа- і магнітафонных касет. Ёсць толькі адна карта з надпісамі на беларускай мове. Для маленькіх дзетак не хапае гульняў і рысункаў з беларускамоўнымі надпісамі. У Польшчы такіх дапаможнікаў не прадукуюць, а з Беларусі — не дасылаюць.

Ужо выдадзены камплект падручнікаў па беларускай мове для падставовых школ і гімназій. Будуць яшчэ друкавацца сшыткі практыкаванняў па беларускай мове. Нядаўна падпісана было пагадненне паміж Беластоцкай кураторыяй асветы і Аблана ў Гродне аб узаемным супрацоўніцтве. У рамках гэтага супрацоўніцтва будуць наперамен арганізаваны на Падляшшы і Гродзеншчыне конкурсы на „настаўніка года”. У конкурсе будуць прымаць удзел настаўнікі беларускай мовы з Беласточчыны і польскай мовы з Гродзеншчыны. На адпачынак у Беларусь будуць маглі выязджаць дзеці і моладзь з Падляшша, а да нас прыязджаць будуць вучні з Гродзеншчыны.

— Спачатку трэба пазнаёміцца з новымі класамі і іх лінгвістычнымі магчымасцямі. Я планую разам са сваімі вучнямі надалей супрацоўнічаць з Музеем малой айчыны ў Студзіводах, „Нівай” і ўключыць вучняў падставовай школы ў беларускае мясцовае жыццё. Калі будуць зацікаўленні тэатральнай дзейнасцю, заснуем тэатральны калектыў. Плануем таксама весці дэкламатарскі гурт, — заявіла Валянціна Бабулевіч, настаўніца беларускай мовы.

У „тройцы” рамантавалася цеплавая сетка. Працаўнікі ліквідавалі школьную кацельню і падключылі ацяпленне да сеткі Гарадскога прадпрыемства цеплавой энергетыкі. Ужо ў мінулым годзе з гарадской кацельні дасылалі цеплаэнергію на абагравание гімнастычнай залы.

— Калі б былі грошы, правялі б мы рамонт гімнастычнай залы. За 8 гадоў карыстання знішчыліся падлога і сцены. Рамонту патрабуюць таксама вонкавыя сцены, якія маляваліся 20 гадоў таму. Патрэбныя новыя парты і крэслы. Сорамна, калі прыязджаюць да нас дэлегацыі і паказваем ім залы, дзе стаяць парты 20-гадовай даўнасці. Патрэбныя нам тэхнічныя прылады працы неабходныя на занятках, — заявіў дырэктар „тройкі” Васіль Ляшчынскі.

Аляксей Мароз

Школа ў Шымках — добры прыклад іншым

Вялікі мураваны будынак школы ў Шымках (Міхалоўская гміна) відаць здалёк. Існуе ён з 1975 года. У ім усе класы ў прасторных залах. Цяпер тут вучыцца 80 дзяцей з семнаццаці вёсак, м.інш. з Юшкавага Груда, Ляўшоў, Ялоўкі, Залешан, Мастаўлян, Бахуроў, Кандраткаў, Ганчароў, Луплянкі, Кітурык, Лявонавічаў і Навасадаў.

У Пачатковай школе ў Шымках працуе 10 настаўнікаў. Урокі рэлігіі вядуць: праваслаўнай — настаяцель Ялоўскай парафіі ды каталіцкай — настаўніца Божага закона. Тут дзеці навучаюцца рускай і англійскай мовам.

У шымкаўскай ПШ многае змянілася на лепшае, калі дырэктаркай стала Ірэна Супрун. Шмат што зрабілі ў будынку і вакол яго. У школе ўставілі новыя вокны, адрамантавалі прыбіральні на ўсіх паверхах ды сілавы зал. У апошні купілі розныя прылады-прыборы, м.інш. „Атлас”, спецыяльныя веласіпеды, драбінкі. Прыгожа абсталявалі-аснасцілі забаўляльную пляцоўку пры школе, аднавілі гімнастычную залу.

У школе адкрылі камп'ютэрную залу, у якой заняткі па інфарматыцы вядзе Вальдэмар Лукша. А камп'ютэры — гэта падарунак школе ад прэзідэнта РП Аляксандра Кваснеўскага. У залы, дзе займаюцца малалеткі, дываны падарыла беластоцкая фабрыка „Агнэла”. У залах вельмі прыемна і ўтульна.

Сёлета правялі грунтоўны рамонт школьнай кухні і сталовай. Цяпер у школе абедаюць вучні і настаўнікі. Адрамантавалі агароджу, браму і форткі. Перад фасадам школы пракладуць брусчатку. Ад усяго ўбачанага я быў у захапленні.

Актыўна працуе вучнёўскі самаўрад пад кірункам настаўніцы Тамары Дурэк. Ён плануе і арганізоўвае забаўляльныя мерапрыемствы, м.інш. зімнія кулікі, экскурсіі ў цікавыя месцы, першнаперш у нашым Падляшскім ваяводстве ды ў бліжэйшых, суседніх. Ладзяць тэатральныя пастаноўкі, а таксама акадэміі з нагоды знамянальных гадавін і святаў. Вучні ахвотна ўдзельнічаюць у добраўпарадкаванні лясных масіваў над Семяноўскім вадасховішчам ды равоў побач дарог у Ялоўку і ў Бандары.

У школе ёсць музычныя інструменты: арганы, раяль, трубкі, тамбурыны, барабанчыкі. Ігры на іх навучае Ірэна Бароўская. Пастаноўкі вучні ладзяць з дапамогай настаўніцы Анелі Монах. Яна кожны год рыхтуе мастацкую праграму на Куццю, навагоднюю ёлку, Дзень маці, Дзень дзіцяці і іншыя.

Школьная бібліятэка даволі багатая — 8 270 тамоў. Тут, перад усім, мастацкая літаратура ды абавязковыя „лектуры”. Вядзе бібліятэку настаўніца рускай мовы Іаанна Верамеюк. 4 верасня купіла яна шмат новых кніжак, дык кнігазбор яшчэ больш узбагаціўся.

ПШ у Шымках можа ганарыцца сваім невялікім этнаграфічным музеем (займае ён адну, затое прасторную залу). У ім багата экспанатаў. Сярод іх шмат колішніх, перш-наперш зробленых з дрэва сельскагаспадарчых ды дамашняга ўжытку прылад, ёсць дываны, вышываныя ручнікі ды настольнікі. Дбайна апекуюцца ім настаўнікі Марэк Харытанюк і Анна Азябла. Пра многае цікавае і незабыўнае з жыцця школы можна даведацца з хронік са здымкамі.

Янка Целушэцкі

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Тэатр з бельскай „тройкі" ставіць пастаноўку „Бунт цацак". Лаўрэат I месца тэатральнага агляду 2003 г.

Вершы Віктара Шведа

Архітэктарам мой тата

Пахваліў сяброўку Шурык:
— Маеш стройную фігуру.
Прыгажуня ты, здаецца,
Не магу я наглядзецца.

Таму кожная дзяўчына
Быць якраз такой павінна.
Адазвалася Агата:
— Архітэктарам мой тата.

Выцягні, бабуля, ногі

Запытала ўнучка строга:
— Выцягнуць умееш ногі?
— Чаму ты мне ставіш Аня
Надта дзіўнае пытанне?

— Чула я і чула матка,
Як сказаў учора татка:
— Выцягне бабуля ногі —
Купім фіяціка малога.

Ніна МАЦЯШ

Вухавёртка

Ад цяпер аж да аўторка
Злоснай будзе вухавёртка:*

*Подлы каларадскі жук***
Выкульнуў ёй дзежку з рук!

Вухавёртцы аж карціць
Жуку вушы накруціць.

Казкі дзяцей з Беларусі

Тры лісточкі

Стаяла восень. На старым Клёне ўжо апалі лісты. Засталіся толькі тры лісцікі. Тры дзяўчынкі. Адну звалі Прыгажунька, другую — Балбатушка, а трэцюю — Палахліўка. Прыгажунька была вельмі прыгожая. Сама жоўценькая, кончыкі зялёныя, а сярэдзінка — чырвоная. Але ж характар у яе быў зласлівы. Хацела яна даўжэй павісець на дрэве. І хвалько такая — свет не бачыў! Другая — Балбатушка — уся была чырвоная. Характар у яе быў не такі ўжо і благі. Толькі пагаварыць надта ж любіла. Як пачне — дык не спыніцца. Ну а трэцяя ўсяго баялася. Аднойчы Прыгажунька пачала скардзіцца:

— Я ж такая! Я ж прыгожая, я ж цудоўная, я ж непаўторная. Як я магу знікнуць? А калі звалюся, мяне ж таптаць будуць! Хны, хны, хны...— і заплакала.

— Чаго ты ўсё плачаш? Ды супакойся ты! Я ж не баюся, — залапатала Балбатушка.

— Дык якая ты! Я ж прыгожая, а ты, ты... — усхліпвала Прыгажунька.

— Ой, я таксама баюся! Што рабіць? — І Палахліўка таксама заплакала.

— Ой, надакучылі абедзве! — засердавала Балбатушка. — Тут трэба нешта прыдумаць, а вы плачаце!

— Што прыдумаць? — спытала Палахліўка.

— Я ведаю. Трэба папрасіць Вецер, — сказала Прыгажунька. — Ён сарве нас і занясе далёка-далёка, дзе мы ніколі не былі. Там нас ніхто не затопча.

— Цудоўна прыдумана! — усклікнула Палахліўка. — Але дзе ж той Вецер гуляе?

Доўга яны чакалі яго. Дачакаліся. Прыляцеў. Першая папрасіла Прыгажунька:

— Эй, ты, паглядзі сюды! Я вельмі-вельмі прыгожая. Толькі ты мяне сарві...

— Ты не маеш права нас зрываць! Ты, ты... пачвара! — забыўшыся пра дамову, усклікнула Балбатушка.

— Ой, пачвара! Ой, баюся! — затрапяталася Палахліўка.

А потым пачалося. Прыгажунька хвалілася. Балбатушка нешта доўга гаварыла, а пасля крычала. Палахліўка плакала. Вецер не вытрымаў — як дзьмухнуў і... паляцеў! Стары Клён паглядзеў яму ўслед адзінока; ніводнага лісточка на ім не было.

Таня Позныш, Мінская вобласць, Мядзельскі раён, Куцькаўская СШ

Пеўнік і бобінка

(П'еса ў адной дзеі, двух абразках)

Дзеючыя асобы: Вядучы, Курка Пяструшка, Пеўнік, Свіння Хаўроння, Гаспадынька Алёнка, Кароўка, Гаспадар, Каваль.

Абразок I

(На сцэне дэкарацыя сялянскага панадворка).

Вядучы:
Жылі-былі пеўнік
Пеця — Чырвоны грэбнік
З разумнай Куркаю Пяструшкай
У двары сялянскім дружна.
(Кажа курачка Пяструшка)

Пяструшка:
Мілы Пеця, ты паслухай,
Я гуляла ў агародзе,
Чула я, што ў народзе
Часам кажуць: хто спяшыць
Той народ увесь смяшыць.
Дык ты, Пеця, не спяшайся,
Памаленьку наядайся.
(Частуе пеўніка зернейкамі. Пеўнік хутка дзяўбе, давіцца і падае).

Вядучы:
Але Пеця паспяшыўся,
Еў бабы і ўдавіўся.
(Падыходзіць да пеўніка, кліча: Пеця! Пеця!)
Вось ляжыць, не рэагуе,
Быццам нежывы, не чуе.
Не крычыць, не варухнецца,
А Хаўроння ўжо смяецца...

Хаўроння: *(Паказвае на пеўніка, яхідна падсмейваецца).*
Ха-ха-ха. Так пасмяшыўся,
Так спяшыўся, што ўдавіўся!

Пяструшка: *(строга).*
Сконч, Хаўроння, гэты смех,
Над бядой смяяцца грэх.
Не магу стаяць я збоку,
Пабягу па дапамогу.
(Падбягае да Гаспадынькі, лапоча крыламі, занепакоена квохча).

Пяструшка:
Куд-куда, куд-куда,
З Пеўнікам бяда, бяда!
Падавіўся зернейкам,
Памажы, Алёнка, нам,
Дай, Алёнка, масельца,
Пашмаруем горлечка.
Пашмаруем хуценька
І праскочыць зернейка.

Алёнка:
Да кароўкі ты бяжы,
Малака хай дасць, скажы.
Масла хуценька саб'ю,
Пеўня ратаваць пачну.
(Пяструшка ідзе да Кароўкі).

Пяструшка:
Ой, каровонька мая,
Дай нам трошкі малака.
Алёнка масельца саб'е,
Пецю ратаваць пачне.
Бо наш Пеця паспяшыўся,
Еў бабы і ўдавіўся.

Кароўка:
Му-му-му! Му-му-му!
Чым магу — дапамагу!
Малачка, каб надаіць,
Трэба трошкі пакарміць.
З'ем травы ахапку,
Малака дам кадку,
Да Гаспадара ідзі,
Хай травы мне дасць, скажы.
(Пяструшка бяжыць да Гаспадара, які сядзіць на лаўцы).

Пяструшка:
Хопіць ужо адпачываць,
Трэ кароўцы траўкі даць.
Вось тады і дасць яна
Для Алёнкі малачка.
Алёнка масельца саб'е,
Пецю ратаваць пачне
Бо наш Пеця паспяшыўся,
Еў бабы і ўдавіўся.

Гаспадар:
Даў бы я, ды чым касіць?
Трэба Каваля прасіць,
Каб даў добрую касу

Скубай ды Кусай!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ці вы заўважылі, што ўласнікі жывёл робяцца на іх падобныя ці наадварот? І з выгляду, і з характару. Вось, гляньце: дама з сабачкам. Яна, гаспадыня, кругленькая, нос кірпаценькі, на твары напышлівая міна, з выгнутымі, надзьмутымі губкамі, а яе сучачка-пекінэса — ну, такая ж злосная, ганарлівая пыска, і дробны, рашучы крок — ну, разыдзіся, кампанія, не бачыце, хто тут ідзе? Даць дарогу модным дамам! У іх нават і прычоскі падобныя! А калі возьмуцца за прамовы! Не ўтаймуеш залівістых выказванняў абедзвюх дам! Альбо, вось, даўгалыгі кучаравы юнак, а каля яго тупае чорны як смоль пудзель. Хлопцы крыху неспакойныя, але хада іх роўная, мэтанакіраваная. Пэўна, з прагулкі вяртаюцца, а дома чакае іх мама са смачным абедам. І няма чаго спяшацца асабліва, прыемна так сабе пахадзіць над рэчкай Белай, ды апетыт ад шпацыру робіцца большы. А што там мама згатавала?.. Можа, і яна такая кучаравая, статная, хоць нестарая. Гаспадыня, у якой двух такіх юнакоў, якіх накарміць трэба... А, вось, гаспадар бульдога, таксама самавіты, з выразным тварам, які не кожнаму спадабаецца, нязлосны, ды да такога лепш не падыходзь. Тым больш, што намарднік свайму кампаньёну зняў. Ой, морда, якую страшнавата напрыцемках спаткаць! Ды толькі выгляд такі ў сабакі, які, дарэчы, мае лагодную ды смачную мянушку Птысь.

А дзядзька Ксавер назваў сваіх аўчарак Скубай ды Кусай. І сваю мураваную хату абгарадзіў высокім плотам, каб пільнавалі яе і падворак з агародам гэтыя вялікія сабакі. А на брамку начапіў табліцы з рысункам сабачай морды: „Я тут пільную” ды другую „Вострыя сабакі”. Бо і мянушкі ў сабак „вострыя” — каб скубалі ды кусалі няпрошаных гасцей. Аддаў іх, Скубая і Кусая, на навуку. Сам ён чалавек добры ды лагодны, усе дзеці з ваколіцы пра гэта ведаюць, ды багаты, і за сваё багацце баіцца. Каб не ўкралі, не спустошылі. А Кусай ды Скубай стаяць на падворку, бегаюць за плотам, і сумна ім. Бо так да дзяцей хочацца! І хоць Ігнась ды Адась, суседскія хлопчыкі, чулі, што злосныя сабакі дзесьці там пакусалі ледзь не насмерць дзяцей, падыходзяць да сеткі з жалезных прутоў, што акаляе маёмасць пана Ксавера, і гамоняць з Кусаем ды Скубаем, частуюць іх бутэрбродамі.

— Прадам я вас! Аддам у прытулак! — палохае пан Ксавер сваіх жорсткіх сабак. — Навошта вас трымаю! Дзе ваша злосць?!

А Кусай ды Скубай шчэрацца да дзяцей у шчырай сабачай усмешцы. Бо і дзядзька Ксавер нязлосны, добры, сваё багацце нажыў без абману, рупнай працай. І ягоныя сабакі таксама добра пільнуюць гаспадарку. Ды што зробіш, калі ўсе яны дзяцей любяць?

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марцін

Неяк большасць хлопцаў — удзельнікаў дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова” — падабрала вершы жартоўнага характару. Марцін Іванюк з гайнаўскай „шасцёркі” выступіў з творам Ніла Гілевіча „Казка без канца пра Дзіму Ласунца”. Ці гэта смешны сюжэт, ці сімпатыя для хлапца, спрычыніліся да агульнай весялосці. Найбольш, вядома, хіхікалі дзяўчаты — відаць, спадабаўся і верш, і сам дэкламатар.

Як мы ўжо адзначылі раней, хлопцы-дэкламатары ўражвалі не толькі выступленнем, але і элегантнасцю!

Зорка

Аліцыя

Дэкламатарскі конкурс „Роднае слова” можа пахваліцца вернымі паклоннікамі. Вось, Аліцыя Міранчук са школы ў Нарве, кожны год прымае ў ім удзел. Часта яна пераходзіць у фінальны этап і на цэнтральным аглядзе прадстаўляе сваю школу.

У гэты раз Аліцыя Міранчук падабрала твор Алеся Каско — „Кірмаш”. Несумненна, на ўзровень і прыгожасць выканання, паўплывала шматгадовая практыка. Аліцыя — лаўрэатка трэцяга месца ў Нараўцы.

Зорка

Слоўнік

* ВУХАВЁРТКА — Forficula fomis — клешчападобнае насякомае. Корміцца раслінамі і жывёльнымі рэшткамі, зрэдку шкодзіць раслінам. Актыўная ноччу, днём хаваецца пад камянямі, карой і ў іншых месцах.

** КАЛАРАДСКІ ЖУК — насякомае, на Беласточчыне вядомае як стонка.

Польска-беларуская крыжаванка № 38

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 34: Вечарына, сын, сава, мята, цадзілка, чарка, Об, мак, акраса. Сок, месяц, чытач, Канада, зрок, мыслік (долата), лама, павук, аладка. Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Пятрусь Герасімюк** з Арэшкава і **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!



То я траўкі прынясу.
(Пяструшка бяжыць да Каваля).

Пяструшка:
Дай, Каваль, ты мне касу,
Аднясу Гаспадару,
Устане Гаспадарык з лаўкі
Ды накосіць свежай траўкі
Траўку дасць кароўцы,
А яна Алёнцы
Дасць збаночак малака,
І тады ўжо яна
Масла хуценька саб'е,
Пецю рataваць пачне,
Бо наш Пеця паспяшыўся,
Еў бабы і ўдавіўся.
(Каваль дастае касу).

Абразок II

Вядучы:
А Каваль цыган быў добры,
Усё рашыў у імгненні вока.

Каваль:
Гаспадарыку касу
Уласнаручна аднясу.
(Падыходзіць да Гаспадара, дае ямў касу).
Вось, няма касы вастрэй
Накасі травы хутчэй
Траўку дай кароўцы,
А яна Алёнцы
Дасць збаночак малака.
І тады ўжо яна
Масла хуценька саб'е,
Пецю рataваць пачне
Бо ж той Пеўнік паспяшыўся,
Еў бабы і ўдавіўся.
(Гаспадар бярэ касу, выходзіць і вельмі хутка вяртаецца з ахапкам травы).

Вядучы:
Дзякуючы Кавалю
Казку ўжо дагавару
Гаспадар, касу ўзяўшы,
Накасіў травы на пашу
Накасіў, прынёс у ахапцы.

Гаспадар:
Эй, Кароўка, частавацца!

Вядучы:
У той жа міг яна дала
Для Алёнкі малака.
(Кароўка дае збаночак малака Пяструшцы).

Кароўка:
На, нясі хутчэй, Паструха,
Асцярожна, не расплюхай.
(Пяструшка бярэ збаночак, бяжыць да Алёнкі).

Пяструшка: *(паспешна)*
Ох і ах, ах і ух
Як тут перавесці дух
Хуценька бягу дадому
Памірае Пеця мой
Збі, Алёнка, масельца,
Можа ён паправіцца.
(Алёнка хуценька збівае масла, дае Пяструшцы).

Алёнка:
Маеш, збіта масельца
Напэўна ён паправіцца!
(Пяструшка бярэ місачку з маслам, бяжыць да Пеўніка).

Вядучы:
Да Пеці Курка падышла,
Трошкі масла прынясла.

Пяструшка:
Дзюбу, Пеця, расчыні,
Сваё горла пакажы.
Пашмаруем хуценька
І праскочыць зернейка.
(Пеўнік расчыняе дзюбу, Пяструшка пёркам шмаруе яму горла, Пеўнік устае, кашляе, прабуе голас).

Вядучы:
Пеця крышку паляжаў,
Спрытна на ногі ўстаў
Пахадзіў ды прыпыніўся,
Курцы ў ножкі пакланіўся.

Пеўнік: *(з паклонам да Пяструшкі).*
Дзякуй за выратаванне,
Больш не будзе хвалявання
Ужо не буду я спяшацца,
Каб ніколі не ўдавіцца.

Вядучы:
Стаў наш Пеця паслухмяным
Разам з Куркаю каханай
Памалу зернейкі дзяўбе,
Песні гучныя пяе!

Пеўнік:
Ку-ка-рэ-ку!
(Заслона).

Пераклала з рускай
Наталля Герасімюк

Сэрца на сметніку

2003 год — годам парадкавання Рэспублікі Беларусь. Па загадзе прэзідэнта, усе гарады, мястэчкі і калгасы павінны адрамантаваць дарогі, пакласці асфальт і тратуары, адсвежыць будынкі і савецкія помнікі. У сувязі са сказаным, рамонтныя работы бачацца як звычайная карціна рэспублікі, а яе грамадзяне — як працаўнікі рамонтнай брыгады. Прэзідэнцкая акцыя не абмінула Вялікай Бераставіцы. У горадзе ўжо паклалі тратуары, адмалявалі будынкі ў цэнтры, аднавілі помнік Леніну. Ля гістарычнага помніка — Касцёла Візітацыі Найсвяцейшай Дзевы Марыі, будавалі новую стаянку. Сярод ссохлых грудаў зямлі валяліся чалавечыя чарапы і косці.

* * *

Наведаць Вялікую Бераставіцу спакусілі звесткі ў турыстычных даведніках. Касцёл Візітацыі Найсвяцейшай Дзевы Марыі быў пабудаваны ў 1615-1620 гг. па фундацыі ўладальніка мястэчка Гераніма Хадкевіча. Сто гадоў пазней будынак быў часткова перароблены, аднак захаваў рысы ранняга барока. З 1866 г. храм служыць праваслаўным, а з 1918 — католікам.

Паводле легенды, у саркафагу спачывала сэрца гетмана Яна Караля Хадкевіча, пераможцы пад Кірхгольмам. Другой рэліквіяй быў абраз Анёлаў Захавальнікаў, напісаны Францішкам Смуглевічам.

У 1794 годзе пры касцёле дзейнічаў шпіталь, пабудаваны па фундацыі Ю. Патоцкай. У другой палове XVIII і першай палове XIX стагоддзя дзейнічала школа. За савецкіх часоў тут знаходзіўся склад тытунёвых вырабаў.

Самы цяжкі час для храма, які смела можна назваць жамчужынай старабеларускай архітэктуры, выпаў... у часы незалежнай Беларусі! Яшчэ ў 1990 годзе быў распрацаваны праект рэканструкцыі, каб перадаць яго вернікам. Два гады пазней у сярэдзіне ўспыхнуў пажар.

Зараз касцёл у аварыйным стане, на звале грузу — у час пажару абарваўся дах — растуць бярозы і быльнёг. Зруйнаваны падзямельныя крыпты, у якіх пахаваны каталіцкія і праваслаўныя святары.

* * *

Пра варварскі падыход да месцаў культу ў Гародні, калі ў выніку рамонту стадыёна „Нёман”, які быў пабудаваны на яўрэйскіх могілках, жыхары квартала знаходзілі людскія чарапы, пратэставала ў красавіку г.г. беларуская і замежная прэса.

Фота Ганны Кандрацюк

Пад касцёлам Візітацыі Найсвяцейшай Дзевы Марыі будуюць стаянку

У Вялікай Бераставіцы кожны, хто хацеў, мог глядзець на астанкі святароў, якія валяліся на раскапаным прыцаркоўным пляцы. Рабочыя, з жыццёвай весялосцю і спакоем, закідалі іх землечарпалкамі на грузавікі і везлі праз горад, каб выкінуць на сметнік. Дарэчы, прысутнасць сямёх журналістаў, якія з фотаапаратамі завіхаліся сярод раскапаных катакомбаў, не прыцягнула ўвагі рамонтнай брыгады... Праблема, аднак, у іншым. Вось, скандал з яўрэйскімі могілкамі ў Гародні, дзякуючы СМІ набыў шырокую вядомасць і абурэнне ў свеце.

Варварскі падыход да нацыянальных, рэлігійных і архітэктурных каштоўнасцей у Вялікай Бераставіцы, назначаны маўчаннем. Факт, што ўжо на другі дзень пра ўсё інфармавала „Народная Воля”, нічога не змяніў.

Ганна Кандрацюк

Фота Ганны Кандрацюк

У разрытых катакомбах валяюцца чарапы святароў

Звон надзеі

Юрка Баена падпісаў мне свежа выдадзены ў Бібліятэцы Беларускага літаратурнага аб’яднання „Белавежа” свой паэтычны зборнік з даволі інтрыгуючым загалоўкам „Крык дзікай ружы”*. Ва ўсіх трох выдадзеных дагэтуль паэтычных зборніках Юркі Баены адлюстравана жыццё і перамены, якія адбываюцца ў нашым беларускім асяроддзі. У зборніку з прыгожым лірычным загалоўкам „Лісты блакітных успамінаў” адлюстраваны хваляванні чуллівай душы паэта, выплываючыя з рамантыкі дзяцінства і маладосці. У зборніку „Вечар над светам” выступаюць ужо трывожныя хваляванні паэта на беразе Семяноўскага вадасховішча з прычыны затопленай нашай спадчыны. Паэт тут яшчэ верыць у выратаванне роднай мовы, пявучыя словы якой *красуюцца на вуснах сына і ў мудрых гутарках унукаў*.

Новы зборнік Юркі Баены „Крык дзікай ружы” ў асноўным адрозніваецца сваім зместам ад двух папярэдніх. Паэт хварэе душою за лёс нашай беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Яго паэтычная творчасць прасякнута несціханым болем за маланкавы асіміляцыйны працэс нашых землякоў. Пераважная частка нашых нацменаў прымкнула ўжо да польскай большасці, асабліва тыя, што пераехалі з вёсак у гарады. У нашых апусцелых беларускіх вёсках састарэлыя сяляне спакойна адплываюць на другі бераг і вёскі паступова зарастаюць маладняком, як працягам Белавежскай пушчы.

Ужо ў першым вершы новага зборніка Юрка Баена паясняе істоту яго загалоўка:

Край мой — крык дзікай ружы,
Спадчына — боль майго сэрца.

Паэт адчувае сваёй душою, што нават дзікая ружа крычыць, крывавіць з прычыны таго сумнага, што адбываецца ў нашым беларускім асяроддзі. Баліць яго сэрца, што пастаянна гіне наша багатая спадчына.

У наступным вершы паэт прысягае на вернасць сваёй беларускай старонцы:

Я — сын гэтага краю.
Я — лёсу абраннік.
На мове пакаленняў
да цябе малюся, роднае.

Няўрымслівы паэт як мага глыбей намагаецца пазнаць сваё беларускае асяроддзе:

Іду. Бягу.
Так хочацца ў жыцці
сваё запоўніць месца.

Нягледзячы на няўдачы паэт перапоўнены аптымізмам, не падае духам:

Кожная рана —
мая перамога,
паказальнік дарог,
паратунак ад злога...

Кожны шрам —
радок верша...

Мой твар запісаны кірыліцай.

Знаёмячыся бліжэй з беларускім асяроддзем паэт даходзіць да высновы, што на Падляшшы жывуць дзіўныя людзі, якія

Звычайна забылі...
Забылі свае імёны.
Роднае пакінулі.
Не думалі, не марылі.
Нічога не патрабавалі.
Нікому не верылі.
Не скардзіліся на лёс,
на боль.

І гэтыя

Безыменныя людзі закрытымі вачыма
пазіраюць на будучыню.
Замкнутымі вуснамі гавораць...

Выракаючыся свайго роднага беларускае асяроддзе пераймае чужое, у першую чаргу чужую мову:

Так абнімаюць нас,
так кахаюць,
да сэрца прытуляюць,
цалуюць,
у дубовай калысцы
люляюць —

словы ўсеагульнай мовы.

Паэт шторaз больш крытычна асуджае сваё роднае асяроддзе:

Як камяні
ляжым сляпыя,
глухія, нямыя.

Маладосці песні —
недаспяваныя.
Старыя вогнішчы —
пакінутыя.

І тут паэт прапануе:

Аднак,
у новым стагоддзі
на найвышэйшай пад небам мачце
давайце яшчэ раз
разгорнем наш сцяг —
б е л а р у с к і я п е с н і.

Нягледзячы на складаныя абставіны ў беларускім асяроддзі паэт сцвярджае з аптымізмам:

Пець? Пяю.
Вачыма роднае бачу.
З вераю праз жыццё іду.
Калі падаю, не крычу і не плачу.
Здавацца? Не такая пара,
бо зямля, айчына, калыска...

У апошнім вершы свайго зборніка паэт заклікае сваіх землякоў:

Іду да вас...
Адчыняйце дзверы,
Адкрывайце вокны.
Святло няхай
увойдзе ў цемру,
дабрыня ў сэрцы.
Неба няхай
раскалыша звон
надзеі.

Зборнік „Крык дзікай ружы” гэта ў сапраўднасці крык чуллівай душы паэта з прычыны пастаяннага ўмірання нашай беларускай нацыянальнай спадчыны.

Усіх, хто поўнасцю не ачарсцвеў душою, у чыіх сэрцах прынамсі жывуць яшчэ мелодыі беларускіх народных песень заклікаю да азнаямлення са зместам надзвычай цікавага паэтычнага зборніка-набата, звону надзеі.

Віктар Швед

* Юрый Баена, *Крык дзікай ружы*, Беласток 2003, сс. 50.

Аб фестывалі „Шагал у Любліне”

Ад 6 да 18 верасня 2003 года ў Любліне прайшоў фестываль культуры, прысвечаны жыццю і творчасці аднаго з выдатнейшых мастакоў XX стагоддзя Марка Шагала.

Галоўнай падзеяй фестывалю „Марк Шагал у Любліне” стала ўрачыстае адкрыццё выставы твораў мастака пад назвай „У садах Эдэма. Марк Шагал — біблейскія сцэны”, прадстаўленых музеем М. Шагала ў Віцебску. У адкрыцці фестывалю прынялі ўдзел унучка Марка Шагала Мэрэт М. Грабер, а таксама пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, прэзідэнт Любліна, прадстаўнікі пасольстваў Францыі, ЗША, Міністэрства культуры Польшчы.

Падчас фестывалю адбыліся прэзентацыя польскага выдання аўтабіяграфіі мастака „Маё жыццё”, канферэнцыі, спектаклі, лекцыі, кінапрагляды.

Выстава твораў Марка Шагала з музея ў Віцебску будзе дэманстравацца ў Гданьску і Вроцлаве. www.mfa.gov.by

У Расіі

Каля магілак новамучанікаў

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Званіца, каля якой сатаніст забіў манахаў

У Свята-Увядзенскі мужчынскі манастыр „Опціна пустынь" дабіраліся мы на старым аўтобусе. Асобам, якія сядзелі ззаду, было душна, бо цяпло выходзіла ад рухавіка. Іх суседзі папалі на скразняк з верхняга акна. Некалькі мужчын, якія ехалі на працу, з'елі агуркі з цыбуляй і заснулі. Жанчыны, якія ехалі ў манастыр, маліліся па малітваслове. Для стаячых асоб вадзіцель даў дошчачкі і тыя, палажыўшы іх на сядзенні, прыселі. Аўтобус пачаткова ехаў па асфальтавай дарозе добрай якасці, пасля дарога ў многіх месцах рамантавалася. Большасць пасажыраў выселі ў Казельску. У гарадку, побач якога былі знішчаны польскія афіцэры, зараз складаныя ўмовы жыцця. Няма тут вялікай прамысловасці, а асобам, якія страцілі працу на дзяржаўных прадпрыемствах, цяжка ўладкавацца ў прыватным сектары. Наш аўтобус даехаў пад самыя манастырскія вароты.

Аднаўляўся галоўны ўваход у манастыр і мы ўвайшлі бакавой брамай. Ва Увядзенскім храме Прасвятой Багародзіцы служылася ўсяночнае богаслужэнне пад святкаванні ў гонар прападобнага Антонія Пячэрскага. Многія вернікі рашыліся затрымацца на начлег. У манастыры можна было пераначаваць дармова, але на наступны дзень трэба было папрацаваць у манастыры або ў полі. Мужчын пасялілі ў гасцініцы ў скіце св. Іаана Хрысціцеля. Перад рэвалюцыяй туды ўвогуле не пускалі жанчын. Яшчэ нядаўна ў скіт маглі ўвайсці жанчыны з арганізаванымі групамі, каб паглядзець на келлі старцаў і прылажыцца да ікон і мошчаў у царкве св. Іаана Хрысціцеля. Жанчын, якія былі з намі ў царкве, пасялілі ў доме за агароджай манастыра і ў спальным вагоне, які выкарыстоўваўся для патрэб паломнікаў. У прыватных дамах, якія знаходзіліся з другога боку манастыра, можна было за 2 долары зняць месца ў пакоі. У некалькі разоў даражэй каштаваў асобны пакой або кватэра. Паколькі мала было вольных месцаў, мы пасяліліся ў летняй альтанцы са шклянымі сценамі. Амаль усе асобы, якія затрымаліся побач манастыра, прыехалі памаліцца. Жанчына, якую я спаткаў шукаючы кватэру, прывезла хворую дачку. Мела надзею, што хвароба міне пасля малітваў і ўдзелу ў царкоўных богаслужэннях. Многія паломнікі прыходзілі ў манастыр яшчэ перад шостай гадзінай раніцы. Пасля ранніх малітваў удзельнічалі яны ў чытанні акафістаў перад мошчамі прападобных опцінскіх старцаў.

Хаця мужчынскі манастыр „Опціна пустынь" узнік у канцы XIV стагоддзя, яго адраджэнне адбылося ў пачатку XIX стагоддзя. У 1821 годзе заснаваны быў скіт св. Іаана Хрысціцеля і запрошаны былі да яго першыя опцінскія старцы Майсей і Антоній. Далучыўся да іх старац Леанід (у схіме Леў) і з таго часу пачалі яны кіраваць духоўным жыццём манахаў і свецкіх людзей, якія прыязджалі да іх за парадамі. Тысячы людзей, пачаўшы ад мужыкоў ажно да царскай сям'і Раманавых, прыбывалі за парадамі ў Опціну пустынь. Прыязджалі сюды пісьменнікі М. Гогаль, А. Талстой, Л. Талстой. Перад рэвалюцыяй у манастыры знаходзіліся кніжны магазін і склад, некалькі гатэляў для паломнікаў, дом для бедных, бальніца, млын і заводы па выпуску чарапіцы і свечак. Ад 1928 да 1987 года манастыр быў закрыты. У час святкавання тысячагоддзя з дня хрышчэння Русі ў 1988 годзе кананізаваны быў прападобны Амвросій, у 2000 годзе адбылося ўсерасійскае праслаўленне 13 іншых старцаў. Зараз манастырскае жыццё хутка адраджаецца. Амаль палова манахаў вучыцца ў Маскоўскай духоўнай акадэміі і семінарыі.

Мы заўважылі, што большасць цэркваў і жыллёвых будынкаў былі нядаўна адрамантаваны. Камуністы настолькі знішчылі манастыр, што трэба было некаторыя цэрквы адбудоўваць паводле даўніх планаў. Зараз па нядзелях і большых святкаваннях богаслужэнні праводзяцца ў Казанскай царкве, дзе знаходзяцца мошчы старцаў Майсея, Антонія і Ісаакія І. Часта богаслужэнні адбываюцца ва Увядзенскай царкве, дзе ляжаць астанкі прападобных Амвросія і Нектарыя. Знаходзіцца там цудадзейная ікона Божай Маці „Спаручніца хлябоў" і часціцы мошчаў. Ва Уладзімірскай царкве стаяць грабніцы з мошчамі прападобных Льва, Макарыя, Іларыёна, Анатолія (Зерцалава), Іосіфа, Варсанофія і Анатолія (Патапава). Некалькі манастырскіх цэркваў знаходзіцца за манастырскай агароджай. Тры царквы яшчэ адбудоўваюцца і адначасна вядуцца рамонты манастырскіх будынкаў. Ахвяраванні, якія выкарыстоўваюцца на рамонты, перадаюцца ад рускіх і замежных вернікаў. Манастыр вярнуўся да рашых традыцый і харчаванне забяспечваецца з манастырскага поля. Працуюць на ім манахі, нанятыя работнікі і паломнікі. У манастыры ёсць сельскагаспадарчая тэхніка, якая выкарыстоўваецца да палявых прац. Некаторыя паломнікі застаюцца пры манастыры нават па некалькі тыдняў і памагаюць у сельскагаспадарчых работах.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Увядзенская царква

Каля манастырскай агароджы знаходзяцца тры магілы опцінскіх новамучанікаў: іераманаха Васілія ды інакаў Трафіма і Ферапонта, забітых сатаністам на Вялікдзень 1993 года. Калі інакі Трафім і Ферапонт званілі, каб абвясціць радасць Уваскрэсення Гасподняга, падбег да іх чалавек з кінжалам (даўжынёй у 60 сантыметраў), на якім быў надпіс „Сатана. 666" і без слова забіў іх. Вяртаючыся да агароджы спаткаў іераманаха Васілія і яго таксама забіў. У лесе злачынца пакінуў закрываўлены нож і ўцёк. Зараз паломнікі запальваюць каля магілак свечкі і просяць дапамогі ў забітых. Вераць, што Гасподзь далучыў іх у лік новамучанікаў. Многія асобы пасля малітваў да забітых мучанікаў атрымлівалі дапамогу ад Госпада.

Аляксей Мароз

Мітрапаліт усёй Амерыкі і Канады ў Польшчы

У днях 4-11 верасня г.г. па запрашэнні мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы Савы з афіцыйным візітам у нашай Царкве пабываў архіепіскап Вашынгтона, мітрапаліт усяе Амерыкі і Канады Герман.

Мітрапаліт Герман, у міры Джозеф Свайко, нарадзіўся 1 лютага 1932 г. у Браерфардзе ў штаце Пенсільванія. Атрымаў вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці адміністрацыя і працаваў у ваеннай адміністрацыі ЗША на Лабрадоры. У 1959 г. пайшоў у адстаўку і паступіў у Духоўную семінарыю св. Ціхана ў Саўт-Канаане, якую закончыў у 1963 г. Тады быў прызначаны персанальным сакратаром епіскапа Кіпрыяна — рэктара Семінарыі. Рукапаложаны ў дыяканы 1 сакавіка 1964 г., а ў свяшчэннікі — 7 красавіка 1964 г. Працаваў у адміністрацыі Семінарыі і выкладаў царкоўнаславянскую мову, выконваючы адначасна абавязкі настаяцеля прыходаў св. Іаана Хрысціцеля ў Дандэфе і св.св. Пятра і Паўла ў Юнёндэйлі. 4 снежня 1970 г. прыняў манаскі пострыг з іменем Германа ў гонар св. Германа Аляскінскага. 17 кастрычніка 1971 г. рукапаложаны ў ігумены і прызначаны настаяцелем Манастыра св. Ціхана ў Саўт-Канаане.

19 кастрычніка павышаны да звання епіскапа, а тры дні пазней прызначаны архімандрытам. Урачыстая хіратонія і ўступленне на прастол Уілкес-Барскага епіскапа, вікарыя Філадэльфійскай і Усходнепенсільванскай епархіі адбылося 10 лютага 1973 г. ва Уваскрэсенскай кафедры. Епіскап Герман выконваў таксама абавязкі часовага адміністратара Заходняй (1975 г.) і Новаанглійскай (1978 г.) епархій. 17 сакавіка 1981 г. прызначаны епіскапам Філадэльфіі і Усходняй Пенсільваніі, а ў маі гэтага ж года стаў рэктарам Семінарыі св. Ціхана. У 1994 г. хіратанізаваны ў архіепіскапы.

Мітрапалітам усёй Амерыкі і Канады архіепіскап Герман быў выбраны 22 ліпеня 2002 г.

Першаіерарх Праваслаўнай царквы ў Амерыцы ўдзельнічаў у святкаваннях у гонар св. Максіма Горліцкага, якія адбыліся 5-6 верасня ў Горліцах, і ва ўрачыстасцях у гонар св. Іава Пачаеўскага, нябеснага заступніка Варшаўска-Бельскай епархіі, якія 10 верасня прайшлі ў Бельску-Падляшскім. Уладыка Герман маліўся таксама ў храмах Варшавы, Любліна, Яблачына, Грабаркі, Беластока і нанёс афіцыйны візіт уладам краіны.

Паводле Праваслаўнага Інтэрнэт-сервіса

З Васілём Зуёнкам на магіле Алеся Гаруна на Ракавіцкіх могілках у Кракаве (24.09.1988 г.).

Злева: Канстанцін Майсеня, Уладзімір Казбярук і Віктар Рудчык. Беласток, 1988 г.

Родам з Беласточчыны

Даследчык, крытык, перакладчык

Старэйшаму беларускаму літаратару Уладзіміру Казберуку 29 жніўня споўнілася 80 гадоў. Сур'ёзны юбілей. Таму, калі аглянуцца назад, дык ёсць што ўспомніць і прааналізаваць тое, што паспелася зрабіць, апублікаваць, выдаць. Крытыкаў і даследчыкаў літаратуры не так часта песцяць на старонках літаратурных выданняў, як, напрыклад, паэтаў, празаікаў ці драматургаў. Яны заўсёды застаюцца ў цяні. Паціху працуюць, а пасля выдаюць неабходныя і каштоўныя кнігі, вартыя свайго часу. Шмат зроблена ў літаратуразнаўстве, крытыцы, перакладчыцкай дзейнасці Уладзімірам Казберуком з Беласточчыны (нарадзіўся ў вёсцы Бандары). У беларускай літаратуры з'яўляецца ён адным з грунтоўных даследчыкаў праблем беларускага рамантызму. Варта толькі прыгадаць па гэтай тэме кнігі Уладзіміра Казберука „Традыцыі польскага рамантызму ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя" (Мінск, 1972), „Рамантычны пошук: Назіранні над беларускім рамантызмам пачатку XX стагоддзя" (Мінск, 1983). Па кнігах нашага земляка настаўнікі-філолагі ў Беларусі вывучаюць творчасць Якуба Коласа. Гэта кнігі „Якуб Колас у школе" (Мінск, 1967, 1975), „Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» (Мінск, 1979),



„Якуб Колас (жыццё і творчасць)" (Мінск, 1962) і іншыя. Па творчасці Якуба Коласа дакастрычніцкага перыяду Уладзімір Казбярук абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Даследчык шмат піша пра польска-беларускія ўзаемаадносіны. Вынікам гэтага сталі яго працы „Традыцыі польскага рамантызму ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя" (Мінск, 1972), „Славянскія літаратуры і праблемы беларускага параўнальнага літаратуразнаўства" (Мінск, 1982).

Вельмі цікавыя і да сённяшніх дзён не згубілі сваёй актуальнасці яго даследчыя артыкулы пра Максіма Горкага, Янку Купалу, Алеся Гаруна, Францішка Багушэвіча, пра Янку Купалу і Марыю Канапніцкую, пра беларускія вершы Адама Міцкевіча, пра невядомыя вершы Зофіі Тшашчкоўскай і г.д. Ніколі не абмінаў і абмінае Уладзімір Казбярук творчасць беластоцкіх літаратараў, шмат напісана ім пра Алеся Барскага, Віктара Шведа і, наогул, пра літаратурную Беласточчыну.

Сяды-тады, жывучы ў розных гарадах — Уладзімір Міхайлавіч Казбярук у Мінску, я — у Слоніме, мы лістуемся. Неяк на пытанне: над чым цяпер працуеце, спадар Казбярук адказаў, што „рыхтую да друку дзённікі Максіма Танка для поўнага збору твораў, а таксама кнігу ўспамінаў пра яго". І калі размова пайшла пра нашу перапіску, дык скажу: што ў кожным пісьме Уладзімір Казбярук прыгадвае і падказвае мне людзей з Беласточчыны, пра якіх неабходна шукаць звесткі і пісаць артыкулы, бо час сатрэ іх не толькі з памяці, але і з нашай гісторыі. Нядаўна ў сваіх пісьмах ён мне зноў нагадаў цікавыя і загадкавыя прозвішчы. Уладзімір Міхайлавіч піша: „Я вельмі шкадую, што вам не ўдаецца знайсці звесткі пра аднаго чалавека і ўшанаваць яго памяць. У навучальным 1940/41 годзе я быў вучнем 10-га класа Свіслацкай сярэдняй школы, дзе перад самай вайной атрымаў атэстат сталасці. Вучань 9 класа гэтай школы Лейба Фарбэр кіраваў струнным гуртком, які прымаў удзел у абласной алімпіядзе мастацкай самадзейнасці ў Беластоку. Там удзельнікаў алімпіяды, сярод якіх быў і я, 22 чэрвеня 1941 года застала вайна. Сам Фарбэр іграў на мандаліне так хораша, што мог ачараваць любога чалавека, нават і найбольш абыякавага да музыкі. За ўсё сваё жыццё такой ігры на мандаліне я не чуў — ні па радыё, ні ў канцэртных залах, ні ў грамафонных запісах. Калі б ён застаўся жывы, ён бы моцна праславіўся. Гэта і пра яго Якуб Колас пісаў:

Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць,
Невядомых, непрызнаных,
Неаплаканых нікім...

У другім пісьме Уладзімір Казбярук пытаецца: „Ці ёсць у вас звесткі пра доктара Мікалая Марцінчыка? Перад вайной ён жыў у Нараўцы. Па даручэнні Р. Р. Шырмы, сюды да яго прыязджаў Максім Танк па грошы на беларускія выданні. Пасля вайны ён жыў у Гародні. Калісьці Зоська Верас паведамляла мне, што ў яе асабістым архіве зберагліся матэрыялы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Міколы Марцінчыка. Думаю, што ён заслужыў, каб недзе добрым словам успомніць яго".

І такіх прыкладаў з пісем шмат. Па іх адчуваецца, што наш зямляк па-ранейшаму ў страі, ён аддана працуе на ніве нашай гісторыі культуры і літаратуры. І нас, маладых, гэта радуе і цешыць.

Сяргей Чыгрын

Незакончаная сустрэча

Было гэта недзе пасярэдзіне жніўня г.г., я акурат пераходзіў вуліцай з аднаго панадворка на другі, а тратуарам ішлі мужчына з жанчынай, невядомыя мне. Нешта, аднак, у маёй душы шапнула, што гэта чыстыя беларусы. І не памыліўся, бо пачуў за сабою словы:

— Вы хіба Панфілюк?

Я павярнуўся да іх, пацвердзіў і ў сваю чаргу спытаў:

— А з кім маю гонар гаварыць?

— Я — Міхась Куптэль, — адказаў мне мужчына, — а гэта мая спадарожніца (на жаль, яе прозвішча я забыў). Ездзім роварамі і шукаем праўдзівых беларусаў, каб пасля ў Гайнаўцы, у сядзібе Міхася Андрасюка, сустрэцца і чыстасардэчна абмеркаваць некаторыя праблемы, якія хвалююць наша штодзённае жыццё. А ёсць аб чым гутарыць.

Мы разгаварыліся і я ўбачыў, што Міхась Куптэль з'яўляецца цалкам іншым чалавекам, чым мне дагэтуль здавалася. Ён, як вядома, часта востра піша, а гэта не ўсім па душы, бо праўда ў вочы коле; мяне таксама не ўсе любяць за мае допісы ў „Ніву". У спадара Куптэля за кароткі час можна было шмат чаго даведацца, бо гэта чалавек здольны і адукаваны ды адданы беларускай справе на Беласточчыне. Пацікавіўся ён, чаму я рэдка пішу ў „Ніву", а я адказаў, што „Ніва" мала якія мае допісы друкуе. Ён рэплікаваў мне, што цяпер, у жніўні, амаль у кожным нумары бываюць мае матэрыялы. Я адказаў, што гэтыя ўспаміны прымусовых работнікаў ва Усходняй Прусіі я выслаў даўно, мо ў месяцы лютым. Мой суразмоўца паведаміў, што і не ўсе яго-ныя матэрыялы з'яўляюцца на старонках „Нівы", але не трэба з-за гэтага падаць духам, але далей пісаць і пісаць, бо і „Ніва" перажывае крызіс і несправядлівыя нападкі з боку польскіх бюракратаў і шавіністаў, пра што ў 32 нумары тыднёвіка слушна напісаў Яўген Мірановіч.

— Не ўсім падабаецца, што беларусы маюць газету на роднай мове, таму хочуць яе ачарніць і белае перайначыць на чорнае, — закончыў спадар Куптэль.

Я ад сябе магу дадаць, што беларусы часта бываюць трусамі і ў іх гонар, гісторыя і, — галоўнае, — еднасць нічога не значаць. „Ніву" рэдка хто купляе, а тыя героі, пра якіх вывазкі ў Прусію я пісаў, купілі толькі тады „Ніву", калі было пра іх; больш яе, на жаль, не купяць.

Спадару Куптэлю спадабалася інтэрв'ю ў мяне спадара Віктара Буры п.з. „Душой і сэрцам за беларускую справу" ў 19 н-ры „Нівы". Я дадаў, што нехта там (рэдакцыя ці аўтар) дапусціў памылку, бо напісана было, што я нарадзіўся 3 студзеня 1943 года, а ў сапраўднасці было гэта 7 студзеня.

На развітанне мы дамовіліся сустрэцца 17 жніўня ў маім доме за кавай. Я чакаў, але госць не з'явіўся, мабыць нешта яму перашкодзіла. Але я веру, што са спадаром Куптэлем яшчэ сустрэнемся.

Мікалай Панфілюк

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Пілаванне камля — хто хутчэй?

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

На міхалоўскай сцэне „Асенні ліст” з Гарадка

Турнір гмін Міхалова — Гарадок — Нарва

Пры сонечным і цёплым надвор'і ў першую нядзелю верасня на стадыёне ў Міхалове (Беластоцкі павет) адбыўся турнір Міхалоўскай, Гарадоцкай і Нарваўскай гмін. Людзей сабралася многа. Прыйшлі яны паслухаць песень у выкананні калектываў, якія дзейнічаюць у Міхалоўскай і суседніх гмінах, а таксама музычнага калектыву „Свіслачане” з Беларусі. Асабліва цікава было паслухаць у выкананні замежнага музычнага аркестра паланезаў, мазуркаў ды танцавальнай музыкі. Добра выступілі ўсе гурты, але вылучаліся „Прымакі” з Гарадка, гарадоцкі „Хутар” і „Расспяваны Гарадок, „Рамонка” з Ласінкі (Нарваўская гміна), „Аксель” з Нарвы. Дыскатэкавы „Аксель” вельмі ж прыпаў да густу моладзі.

На стадыёне адбыліся футбольны і гандбольны матчы. У іх пераможцамі сталі спартыўныя каманды з Міхалова. У спаборніцтве добраахвотных пажарных каманд першынство заваявала каманда з Нарваўскай гміны. У спаборніцтвах войтаў, найлепшых поспехаў дабіўся войт Міхалоўскай гміны Марэк Назарка. Сярод дэпутатаў першынство заваявалі таксама прадстаўнікі Міхалоўскай гміны. Перамаглі яны дэпутатаў з Нарваўскай гміны (другоге месца) і Гарадоцкай гміны (трэцяе). Сярод вудзільшчыкаў першае месца заняў „рыбак” з Гарадка, другое — з Нарвы, трэцяе — з Міхалова. У пілаванні камля перамаглі пільшчыкі з Міхалова. Яны апярэдзілі гарадоцкіх і нарваўскіх. У цяганні каната лепшыя былі асілкі з Міхалова. Другое месца занялі гарадоцкія і трэцяе — нарваўскія. Спаборнічалі таксама жанчыны. Убівалі па тры гвоздзі ў пянёк на час. Найлепшай была прадстаўніца прыгожага полу з Міхалоўскай гміны. Апошняй закончыла канкурэнцыю саперніца з Гарадка. Ва ўзважванні харчовых прадуктаў (былі м.інш. каўбаса і тварог) найлепш справілася прадстаўніца Нарваўскай гміны. Уступіла ёй прадаўшчыца з Міхалова.

Спаборнічалі лепшыя трактарысты. Абсалютным пераможцам стаў Славамір Раеўскі з Міхалова. Другое месца заняў удзельнік спаборніцтва з Гарадоцкай гміны і трэцяе — з Нарваўскай.

Усялякіх канкурэнцый было процьма. Ажно вечарам падвялі вынікі. Першае месца заняла Міхалоўская гміна і ва ўзнагароду атрымала спецыяльны прыз — Пераходны кубак, другое — Нарваўская гміна і трэцяе месца — Гарадоцкая гміна. Падчас уручэння ўзнагарод у неба паляцелі шматколерныя феерверкі, а на сцэне адкрылі шампанскае. На заканчэнне забаўляльна-адпачынковага мерапрыемства ўжо позным вечарам адбыліся выступы эстраднай зоркі — калектыву „Больтэр”. Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Вынікі засухі

Аб праблемах сёлетняй засухі ў рэгіёне размаўляў ваявода Марэк Стшалінскі з прадстаўнікамі Саюза жывёлаводаў ды Падляшскай сельскагаспадарчай палаты.

Страты ад засухі ў Падляшскім ваяводстве ацэньваюцца на больш за 52 мільёны злотых. Найбольш дакучыла яна Сямятыцкаму, Беластоцкаму і Сакольскаму паветам. Ва ўсім ваяводстве аб'ёмных кармоў будзе на 50% менш, чым у мінулым годзе. Плён кукурузы паменшыцца на 20%, цукровых буракоў будзе менш на 25%, а бульбы ў некаторых паветах нават на 33%.

У Падляшскую ваяводскую ўправу паступілі 340 заяў на крэдыты па стыхійнаму няшчасцю. Сярэднія сумы, за якіх хадайнічаюць сяляне, невысокія — 800-900 злотых. Аднак, шмат з іх увогуле на гэта не рашаюцца, а звяртаюцца на адтэрміноўку ранейшых. Заданнем як сельскагаспадарчых арганізацый, так і ваяводы была б выпрацоўка формы ўвядзення ўсеагульных страховак палеткаў, жывёлы і сельскіх будынкаў. Найлепшай ідэяй было б Таварыства ўзаемных страхаванняў, якое ахоплівала б таксама іншыя ваяводствы ў Польшчы. На думку пачынальнікаў гэтай ідэі, 75% страховачнага ўзносу было б рэгулявана бюджэтам дзяржавы, а апошнія 25% — сялянамі.

Тым часам некалькі дзён пасля сустрэчы, 8 верасня (у панядзелак!) падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі ўдзельнічаў у экуменічным ваяводскім Свяце плёну, якое праводзілася ў Драгічыне. Пасля набажэнства ў царкве св. Міколы і мясцовай каталіцкай катэдры дзяліўся ён хлебам з сабранымі. Як ніколі старостамі было сужонства праваслаўнага веравызнання. Такі экуменічны характар ваяводскае Свята плёну мела на Падляшшы першы раз, хоць, як сцвярджалі прысутныя на ім сяляне, на падобных гмінных святах здараецца гэта вельмі часта. На завяршэнне ўрачыстасці над Бугам адбыліся выстаўка плёну, выступленні народных калектываў і падведзены былі вынікі конкурсу „Жніво можа быць бяспечным”.

(холм)

Цікавая экскурсія

Вось ужо некалькі гадоў Гмінны саюз пенсіянераў у Нараўцы арганізуе экскурсіі па Беласточчыне. Напрыканцы лета адбылася чарговая экскурсія ў Асавец, што над ракою Бобраю.

Тут знаходзіцца старая руская ваенная крэпасць „Асавец”. Сталі яе будаваць пад канец XIX стагоддзя, а дакладней — будавалі ў 1882-1892 гадах. Мадэрнізацыйныя працы цягнуліся да 1914 года. Крэпасць пабудавана ў месцы, дзе багністая і недаступная даліна Бобры найбольш вузкая і выгодная для варожай пераправы. У свой час Асавецкая крэпасць адыграла важную стратэгічную ролю, так у першай, як і другой сусветнай вайне. У адным з фортаў крэпасці знаходзіцца таксама невялікі ваенны музей. Царская крэпасць займае немалую плошчу. Цэлыя дзе гадзіны пенсіянераў з Нараўкі вадзіў па крэпасці экскурсавод Шэпель. Удзельнікі экскурсіі захапляліся веліччу і магутнасцю старой ваеннай пабудовы. Большасць прац рабочыя выканалі тады ўручную. Мясцовыя людзі адзначаюць, быццам тады добра плацілі рабочым. Усе экскурсанты шмат даведаліся аб мінулым, якое стала ўжо гісторыяй, усе былі задаволены падарожжам. Хто не паехаў, той можа цяпер шкадаваць.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Найпрыгажэйшыя сялянскія сядзібы

9 верасня падчас сесіі Рады гміны Нараўка (Гайнаўскі павет) падвялі вынікі конкурсу на „Найпрыгажэйшую сялянскую сядзібу-2003”.

Першае раўнапраўнае месца конкурсная камісія прызначыла Зіне Раманчук з Альхоўкі, Галіне Банцарэвіч з Масева і Вользе Адамюк з Ахрымоў.

Другое месца занялі Крыстына Грэсюк з Новага Ляўкова, Лена Харкевіч з Плянты і Софія Каліноўская з Нараўкі, а трэцяе — Анна Харкевіч з Лешукоў і Галіна Вяжхоўская з Заблотчыны.

Вылучэнне атрымала жыхарка Плянты Галіна Бірыцкая. Лаўрэаткам конкурсу ўручылі ўзнагароды.

(яц)

Птушыная салідарнасць

Люблю назіраць натуру. Раблю запіскі. У мінулым годзе пад датай 15 жніўня запісаў: „Адляцелі буслы”. Прыпамінаю, як кружыліся над чаромхаўскімі пашамі. Высока падымаліся ды доўга лёталі, быццам склікалі сваіх у дарогу. Так і сяголета было. 20 жніўня на Кузаву быў зроблены сапраўдны налёт. А ўсё па прычыне маладога бусліка, які не мог узляцець. Некалькі дзесятак буслоў засела на электрычных слупах побач царквы і суседніх стадолах. Некалькі прызямліліся на гняздо ды давай дзюбаць кволае бусляня, быццам застаўляць яго да палёту. Гэтае відовішча працягвалася больш за гадзіну. Без выніку. Маладое не паднялося з гнязда. Птушкі адляцелі, пакідаючы на гняздзе бусліху з двума маладымі. Некалькі дзён я назіраў за птушкамі. (Два гады таму званіў я ў Беласток, каб забралі астаўшагася бусла з сядзібы Сцяпана Бішчука). І вось што прыкмеціў. Бусліха не дапускала маладых сесці на гняздо, застаўляла да палёту. Зараз засталося пустое гняздо побач царквы. Сябра з Кляшчэляў гаварыў, што пасля Успення бачыў каля трыццаці буслоў, ляцеўшых на поўдзень. Пэўна там былі і кузаўскія буслы. Уладзімір СІДАРУК

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Ну і дакаціліся...

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Пленум ЦК КПСС на Крамлі. Уваходзіць стораж і аб’яўляе:

— Хто можа, хай устане, бо зараз унясуць прэзідыум.

* * *

Сталіну даклалі, што знайшлі яго двайніка.

— Расстраляць! — загадаў Сталін.

— Таварыш Сталін, — пытае адзін з сакратароў, — а мо згаліць яму вусы?

— Добрая ідэя: абгаліць і расстраляць!

* * *

Пасля адкрыцця межаў Расіі расійская ведзьма села на мятлу і рашыла пабачыць свет. Ляціць над Францыяй і бачыць французскую чараўніцу, якая ляжыць на ўквечаным лузе.

— Што ты выраблеш!? — абураецца госця. — Зусім голая!

— Гэта не галізна, толькі мой эратычны касцюм.

Вярнулася госця да сябе дадому, распранулася дагала, легла на квітнеючы луг. З суседняй пячоры вылез змей, глянуў і крыкнуў:

— Ці ты, ведзьма, здурэла?! Дагала...

— Гэта не галізна, толькі мой эратычны касцюм!

Змей пачухаўся па грэбені на галаве і кажа:

— Паслухай, а не змагла б ты яго крыху адпрасаваць?

* * *

— У час апошняй зімы, — кажа паляк беларусу, — у нас былі такія маразы, што мы былі прымушаны спаць з адкрытымі вачыма каб нам вейкі да сябе не папрымярзалі.

— Гэта дробязь! У нас з рота словы выляталі ў відзе ільдзінак і, каб пачуць хто што гаворыць, трэба было тыя ільдзінкі размарожваць.

* * *

У горах пры Гамулцы не выканана планавых паставак воўны. Дзеля ратавання плану ўлады рашылі абстрыгчы ўсіх чабаноў. У час такой стрыжкі адзін з чабаноў гаворыць другому:

— У нас то яшчэ не бяда, але я прачытаў у газеце, што на Беласточчыне праваліліплан скупкі яек!

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31	32	33	34	35	36	37	38	39

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць выказванне старажытнагрэчаскага філосафа Сакрата — рашэнне адгаданкі.

1. правы прыток Волгі = 7 __ 21 __ 29 __;
2. горад між Магілёвам і Жлобінам = 17 __ 31 __ 32 __ 15 __ 16 __;
3. шум, гул, гудзенне = 6 __ 33 __ 24 __ 39 __ 4 __;
4. у сямі нянек яно без носа = 34 __ 19 __ 36 __ 37 __ 1 __;
5. гомельская рака = 9 __ 25 __ 26 __;
6. любімы занятак у вольны час = 23 __ 5 __ 30 __ 22 __;
7. верхняя частка галавы, верх чэрапа = 10 __ 18 __ 3 __ 20 __;
8. аднайменнік = 38 __ 8 __ 35 __ 2 __ 28 __;
9. простанароддзе або вугальная фарба арганічнага паходжання = 14 __ 13 __ 12 __ 27 __ 11 __;

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 31 нумара

Дзея, пан, плюс, смех, хам.

Рашэнне: **Паспех людзям на смех.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

Фэст на фэст

Загуляў я ў наша свята. Наша, значыць, Падляшскае. Выбраўся я на дзень нараджэння нашага ваяводства. Разам з Колем ды Збышкам. Бо, так сказаць, гэта свята і „рускіх”, і „польскіх”. Асабліва Збышка, курп з курпаў, якога заўсёды цягне на ўсход, і жонку ўзяў сабе нашу дзяўчыну, ды так сабе дома размаўляюць па-беларуску з курпёўскім акцэнтам, хацеў добра пагуляць. Людзей пабачыць выйшлі мы, сябе паказаць. У цэнтры Беластока, пад ратушай, якая ніколі не была, не ёсць і не будзе ратушай, кішэў народ. Пачынаўся дзень нараджэння Падляшша, а таксама і пачатак мастацкага сезона ў нашай падляшскай сталіцы. На хадулях валэндаліся розныя цудакі, палохаючы дзяцей і паненак. Асабліва смерць упадабала нас, трох дзядзькоў, якім на той бок ніяк не спешна. Стаялі мы з піўцом недалёка ад сцэны, на якую запрасілі ўладныя персоны, прыгадваючы Івана Сапегу, першага падляшскага ваяводу. Можа, наша пітво было недаспадобы гэтай доўгай даме ў белым ды з касой? Дык чаму не палохала добрую кампанію з рудабародым мастаком, які першы рассакрэціў, дзе даюць капусту. І пад тую гарачую капусту разліваў белыя пляшкі, а дамы, якія з ім сядзелі, павісквалі пад музыку. Уцякаючы ад паганай смерці і мы дайшлі да таго запаветнага стала.

— Што святкуем? — запытаўся я ў рудога дзядзькі, калі той хапіў мяне ў шчырыя абдымкі.

— 490-годдзе. А праз дзесяць гадоў — паўтысячагоддзя будзем адбалёўваць. Ну, хлопцы, па чарачцы!

— А ці то ся годзі? — перапытаў Збышка.

— У якім сэнсе? Што па чарачцы? Належыцца! Мы тутака, за гэтым сталом — усе з княства. Во, а той тоўсты, чарнявы, дык з дваровай шляхты. І ў мяне пажонднае прозвішча. А вы, пане Арлянскі, з засценка якога будзеце?

— Хутчэй з жыдоў! — прабурчаў таўстун, былы галоўны рэдактар штодзёнкі, якая калісьці, ужо не за яго часу, уславілася палемікай пра крыжы рознай масці. — То такія там Беластоцкія, Слонімскія, Варшаўскія, Познанскія, ну, і вядома, Арлянскія. Усе быццам „-скі”, „-скі”, а пэйсы звісаюць.

— То ж бландзіністы наш Вандал, — глянуў на мяне руды мастак са свойскім прозвішчам не на „-скі”.

— А ці быў? Пасівее такі, і арыйцам прыкідваецца. Ну, нос не гаплюком, праўда, але, так сказаць, чэрап... — падключыўся высокі, светлы гісторык, што ад нейкага часу праціскаўся за намі праз натоўп, распіхаючы люд дужманым жыватом.

— Дык я — беларус! А, дарэчы, магу быць і яўрэем. Усе мы ад Адама і Евы. А свята наша, от цо.

— А дакажыце!

— Кажуць, у вас нават мерачка ёсць, каб чэрап мераць, і капыл, каб па яго форме ўстанаўляць, хто ён такі і адкуль прыехаў.

— Не, мерачкі ў мяне няма! — пачырванеў гісторык. — Хто вам пра гэта сказаў! Ёсць навуковыя доказы. Дарэчы, вы ніякія не беларусы, бо няма такое мовы, а тутэйшыя.

— О, псяягамаць! — Збышка збрыдкасловіў невядома на чыю маць, а шчанюк, які запутаўся яму якраз пад ногі, спалоханы феерверкамі, якія ўзрываліся з вялікім пшыкам з грывы драўлянага Пегаса, узвыў. Мастак хуценька ўручыў нам усім па пластмасавым кубачку і хліснуў з белай бутэлькі. На жаль, гэта была вада. От, свята.

Я памацаў свой шляхетны чэрап.

Вандал Арлянскі

Метад: як-небудзь

— Штосьці трэба зрабіць, каб звярына не свіргатала ў адцягненасці ад праблем, якімі жывуць узлескі, — пачаў чарговы сход уселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч.

Дзяцел Стукач, прачнуўшыся, затрапятаў крыламі:

— Ага, свіргочуць ды чырыкаюць без ладу, а найбольш аб нашых сяброўках.

Вавёрка Кацюша і лань Гаўрусіха глянулі на сябе са здзівам.

— Аб кім, значыцца? — спыталіся дуэтам.

— А аб Гаўрусішыных путавых костачках і Кацьчынай кіце, — данёс Стукач.

Барсук Барушчук апусціў мызу ўніз і зарагатаў.

— Чаго рагочаш! — замахнулася нервова хвастом на яго вавёрка.

— А так сабе. Штосьці мне прыгадалася... — тлумачыўся Барушчук, ды не мог паўстрымацца ад смеху.

— Хопіць гэтага! — зароў Сандар Жоржавіч. — Справа тутака сур’ёзная. Кацьку ды Гаўрусіху можна было б падставіць лясной звярыне на свіргатанне, але наша лясная брацыя штораз гучней хляпае аб нашай мядзведжай велічнасці.

Вавёрка і лань апусцілі вочы ў мох; адчулі сваю знявагу.

— Дамы мае дарагія, я гэта проста так. То ж я вас ніколі ды нікому не падстаўлю, — супакойваў сяброўак мядзведзь. — Толькі трэба кончыць са свіргатаннем, з гэтым дурным хляпаннем пашчамі.

Барушчук сур’ёзна ды ледзь не з філасофскай задуменнасцю запытаўся:

— Толькі я-я-як?

— Як-небудзь, — рашуча адцяў Жоржавіч.

Кіраўніцтва падтакнула са зразуменнем, хоць у сапраўднасці ніхто нічога не ўцяміў.

— Добрае вы маё кіраўніцтва. Заўсёды магу разлічваць на ваша, так сказаць, зразуменне. Дык вось ідзіце ў лес і як-небудзь палагодзьце гэтую праблему, — завяршыў сустрэчу мядзведзь.

Вярнуўся ў сваю бярлогу. Як заўсёды, пасля ўтомных сходаў кіраўніцтва, надумаўся паспаць. Лёг. Заплюшчыў вочы. У думках прамільгнула бліскучая ідэя:

— Ну, будзе як-небудзь.

І заснуў салодкім сном. Сніліся яму ўзлескі і кіраўніцтва, якое як-небудзь супакойвае парожняе свіргатанне. А ў лесе стала царыць усё большая ціш, і не абы-якая, а найцішэйшая з цішаў — пад мядзведжы загад.

МакХолад

ISSN 0546-1960